АДРАС ДАПАМОГІ – КУРСК 8

ТВОРЧАСЦЬ МАЛАДЫХ 12

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

21 ВЕРАСНЯ 2024 г. СУБОТА № 185 (30319)

КАРАТКА

• **Кітай акажа Беларусі тэхніка-эканамічную дапамогу ў 300 млн юаняў на праекты развіцця.**

• Цэны на паслугі сувязі ў роўмінгу на тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза плануюць знізіць у першым квартале 2025 года.

• **У Гродзенскай вобласці ў банку вакансій знаходзіцца больш як 19,8 тысячы прапаноў.**

• Рэлігійнае аб'яднанне «Беларуская праваслаўная царква» першым з рэспубліканскіх завяршыла неабходныя працэдуры і прайшло перарэгістрацыю.

• **У Гродзенскім раёне вядуць уборку соі.**

ЦЫТАТА ДНЯ

Святлана ЛЮБЕЦКАЯ, суддзя Канстытуцыйнага Суда:

«Рэспубліка Беларусь працягвае ўдасканальваць выбарчую сістэму, выбарчае заканадаўства, у тым ліку з пункту гледжання норм міжнароднага права, вопыту іншых краін. Але арыентуючыся на нацыянальную ідэю, нацыянальныя традыцыі, што і дае магчымасць выпрацоўваць нашы аўтэнтычныя спосабы пабудовы палітычнай сістэмы і рэалізацыі тых задач, якія стаяць перад нашай дзяржавай, якую мы бачым як справядлівую, эфектыўную, у якой рэалізуюцца ўсе стандарты дэмакратыі».

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ГАЛОЎНАЕ, КАБ МЫ ПЕРАСТАЛІ КЛАНЯЦЦА ІМПАРТНАМУ ЯБЛЫКУ»

Чым здзівіла фермерская гаспадарка пад Маладзечнам

Пятніца ў графіку Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, адказных за садавіну кіраўнікоў і журналістаў прайшла са смакам яблыкаў. Кіраўнік дзяржавы наведаў сялянскую фермерскую гаспадарку «СПАРТАН-АГРА», якая займаецца вырошчваннем яблыкаў і сельгаспрадукцыі. Прадпрыемства адметнае не толькі сваёй прадукцыяй, але і цікавай гісторыяй.

Напрыканцы 90-х жыхар Маладзечанскага раёна Аляксандр Абрамчык вырашыў заняцца вырошчваннем беларускіх яблыкаў замест таго, каб вазіць іх з Польшчы. Маладзечанскі райвыканкам яму выдзеліў калгасны сад плошчай 10 гектараў, засаджаны дарослымі дрэвамі яшчэ ў 1950-я гады. Было вырашана «ветэранаў» захаваць і ў той жа час стварацьновыя насаджэнні. Сад пачаў даваць «тэхнічны» ўраджай у 2001 годзе. Затым Аляксандр Абрамчык дадаў да сваіх угоддзяў яшчэ 40 гектараў. Цяпер яблыневыя сады займаюць больш за 70 гектараў зямлі, на якіх расце больш за 100 тысяч дрэў. З часам кіраванне гаспадаркай на сябе ўзяў сын Аляксандра Абрамчыка Ігар. Ён вырас на зямлі, дапамагаў бацьку працаваць, але вырашыў атрымаць прафесію інжынера-эканаміста, каб у выніку вярнуцца да зямлі. Прынамсі, інжынерны дыплом лішнім не аказаўся. Ігар Абрамчык арганізаваў вырошчванне яблыкаў па самых перадавых тэхналогіях — у гаспадарцы ўсё камп'ютарызавана: ад метэастанцыі да паліву і падкорму дрэў. Ігар Абрамчык працаваў разам з Прэзідэнтам падчас рэспубліканскага суботніка. Тады ж ён і запрасіў Аляксандра Лукашэнку наведаць «СПАРТАН-АГРА». Кіраўнік дзяржавы запрашэнне прыняў.

Фота БелТА.

НЕ ТОЛЬКІ ВЫРАСЦІЦЬ, АЛЕ І ЗАХАВАЦЬ

Як расказалі Прэзідэнту, тут растуць найлепшыя яблыкі ў вобласці. «Найлепшыя, таму што канкурэнтаў няма», — паўжартам заўважыў ён. Ігар Абрамчык адказаў, што канкурэнтаў у яго няма, толькі калегі. «Павінны быць канкурэнты», — сказаў беларускі лідар. Прэзідэнт актыўна цікавіўся не толькі станам спраў сёння, але і планамі кіраўніка гаспадаркі, перспектывамі прадпрыемства. «Галоўнае, каб мы перасталі кланяцца імпартнаму яблыку. Трэба, каб быў свой яблык, каб людзі былі забяспечаны. Патрэба ў нас вялікая», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

СТАР. 2

Актуальна

ЗАМЕНЕНА АБСТАЛЯВАННЕ І ПАДРЫХТАВАНА ПАЛІВА

Энергетычны комплекс краіны гатовы да ацяпляльнага сезона

На двары яшчэ па-летняму цёпла, а айчынныя спецыялісты ўжо цалкам праверылі тэхнічны стан унутраных газаправодаў жыллёвага фонду. Нарыхтавана неабходная колькасць топачнага мазуту, укамплектаваны сродкамі абароны і патрэбнымі матэрыяламі аварыйныя брыгады, паведаміў начальнік управлення па фарміраванні навуковай палітыкі ў галіне газазабеспячэння і забеспячэнні агульных відаў дзейнасці аб'яднання «Белпалівагаз» Аляксандр БЕЛКІН.

СТАР. 7

Стыль

«ГАЛОЎНЫ ГЕРОЙ» ГЭТАЙ ВОСЕНІ

Шукаем моднае паліто ў калекцыях беларускіх брэндаў

Глабальнае пацяпленне — не выдумка высакалобых удзельнікаў навуковых сімпозіумаў, сведчыць бягучая восень: +25 °С у сярэдзіне верасня і ні намёку на «тихое природы увядание». І ўсё ж лета не вечна будзе з намі. А значыць, дзяўчатам усіх узростаў пара задумацца аб дэмісезонным паліто, «галоўным героі» восеньскіх вобразаў.

І, прымаючы да ўвагі непазбежнае хуткае пахаладанне і цэны на рэчы нават хоць колькі-небудзь вядомых еўрапейскіх брэндаў, мы вырашылі высветліць, што прапаноўвае беларускім модніцам напярэдадні «сезона паліто» наш родны легпрам.

СТАР. 13

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СА «ЗВЯЗДОЙ» ЦЯПЛЕЙ І ЎТУЛЬНЕЙ!

Ідзе падпіска на IV квартал 2024 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ ВОСЕННЮ І ЗІМОЙ. БУДЗЕ ЦІКАВА!

«ГАЛОЎНАЕ, КАБ МЫ ПЕРАСТАЛІ КЛАНЯЦЦА ІМПАРТНАМУ ЯБЛЫКУ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што неабходна актыўна падтрымліваць развіццё пладаводства ў краіне, у тым ліку і выдзяленне гэтай гаспадарцы дадатковых зямель. «Хоць на 1000 гектараў забяспечым», — сказаў ён. Аднак Прэзідэнт звярнуў увагу, што спецыялістам «СПАРТАН-АГРА» трэба дзяліцца вопытам з калегамі, па яго словах, было б нядрэнна, калі б яны паспрыялі развіццю садаводства і ў іншых рэгіёнах: «Каб ты дапамог людзям закласці сад. Галоўнае ж — закласці. І будуць паўтараць. Як ты даглядаеш, так і яны, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Гэты цуд наогул. Шчыра кажучы, я такога не бачыў яшчэ». Ігар Абрамчык расказаў, што на базе гаспадаркі рэгулярна праходзяць семінары, на якія прыязджаюць фермеры-садаводы з усёй краіны.

Цікавы факт — усе яблыкі збіраюцца ўручную. Плады трэба акуратна зняць з галін і беражна пакласці ў скрыню, каб не пабіліся. Па словах Ігара Абрамчыка, гэта вельмі карпатлівая і далікатная праца, таму выконваюць яе пераважна жанчыны. Калектыў у гаспадарцы невялікі, але для ўборкі смачнага ўраджаю прыцягваюць жыхароў Маладзечна і навакольных вёсак. Аляксандр Лукашэнка параіў прыцягваць і школьнікаў са студэнтамі.

Асобна кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з тым, як захоўваюцца яблыкі ў спецыяльных сховішчах. Ён нагадаў пра даручэнне прывесці ў парадак і стварыць умовы для захоўвання садавіны і агародніны ў сховішчы ААТ «Александрыйскае». Ён прапанаваў падключыцца да гэтай работы і Ігару Абрамчыку. «Вялізнае сучаснае сховішча. Гэта злачынства, калі мы там не будзем мець вось такі інтэнсіўнага характару сад. Тым больш: перавёз праз граніцу — прадаў у Расіі», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт акцэнтаваў, што работа над вырошчваннем садавіны павінна ісці больш актыўна: «Зараз санкцыі: вязуць — не вязуць. А ў цябе раздолле. Заўтра пачнецца гэта канкурэнцыя, можа быць па-іншаму. Санкцыі — гэта час магчымасцяў. Трэба хутчэй гэта зрабіць», — канстатаваў ён. Міністру антыманапольнага рэгулявання і гандлю Аляксею Багданаву Прэзідэнт даў даручэнне: «Трэба дапамагаць. І дакладна ведаць, колькі нам трэба на краіну, колькі рынак можа спажыць». Задача — не толькі забяспечыць патрэбы краіны, але і пастаўляць на экспарт.

УСЕ ПЫТАННІ ТРЭБА ВЫРАШАЦЬ ІМГНЕННА

Ігар Абрамчык расказаў, што прадукцыя «СПАРТАН-АГРА» пастаўляецца ў Расію, у прыватнасці, беларускія яблыкі вельмі любяць на Далёкім Усходзе. Не паўкрыўджаныя і беларускія гандлёвыя сеткі. Сёння краіна забяспечана айчыннымі пладамі ў поўным аб'ёме з верасня да лютага. Але, каб у беларусаў была магчымасць купляць беларускія яблыкі з саканвіка да мая, трэба высаджваць

Фота БелТА.

сарты, прыдатныя для працяглага захоўвання, і, зразумела, стварыць належныя ўмовы для захоўвання з рэгуляваным газавым асяроддзем, чаго цяпер не хапае. Ігар Абрамчык як спецыяліст расказаў, што трэба, каб закрыць пытанне з яблыкамі для краіны: сарты, якія могуць ляжаць, і сучасныя сховішчы для іх захоўвання. «Усе пытанні трэба вырашыць імгненна, наколькі гэта магчыма. Без усялякіх правалочак, — запатрабаваў ад чыноўнікаў Аляксандр Лукашэнка. — Праграма, аб'ёмы, выдзеліць пэўныя крэдыты. Трэба паглядзець эканоміку. Раскідвацца грашыма мы не можам. А там, дзе трэба падставіць плячо, мы павінны падставіць». Кіраўнік дзяржавы заявіў, што сёння неабходна выпрацаваць у пладаводстве пэўную праграму пад патрэбы і магчымасці вытворцаў. «Давайце канкрэтную праграму. Вось ён хоча 300 гектараў дадаць. Можа, болей. Збяром гэтых людзей, спытаем, што ім трэба, дапаможам і закрыем пытанне», — сказаў ён. Кіраўнік дзяржавы зрабіў акцэнт на тым, што трэба развіваць высокаэфектыўнае садаводства. Старыя сады, якія не даюць патрэбнага выніку, неабходна выкарчоўваць і закладваць новыя.

У цэлым аб развіцці пладаводства ў Беларусі далажыў міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Анатоль Ліневіч. Прыярытэтныя напрамкі ў гэтым плане ўключаюць штогадовую пасадку 500 га яблынь, нарошчванне грушавых садоў, пашырэнне асартыменту костачкавых і ягадных культур, нарошчванне пасадак арэхаплодных. Вядома, сваё слова павінна сказаць і навука, неабходна правесці раяніраванне асобных сартоў для патрэб садоўніцтва ў прамысловых маштабах. За 2021—2023 гады закладзена 2,5 тысячы гектараў пладовых і ягадных культур. За 2023 год за кошт плоданашэння маладых садоў у сельскагаспадарчых арганізацыях і фермерскіх гаспадарках выраблена 221,4 тысячы тон пладоў і ягад. Імпарт яблыкаў у 2023 годзе ў адносінах да 2021 года скараціўся на 66 працэнтаў. У мінулым годзе продаж айчынных яблыкаў склаў 31 тысячу тон.

Зразумела, што размаўляць аб прадукцыі і не пакаштаваць яе было немагчыма. Падчас дэгустацыі Прэзідэнт высока ацаніў смак як яблыкаў, так і груш — у «СПАРТАН-АГРА» ўжо асвойваюць і іх вырошчванне. І гэта насамрэч вельмі важна, бо вялікіх прамысловых грушавых садоў у краіне пакуль няма. Візіт кіраўніка дзяржавы работу на прадпрыемстве не спыніў — у разгары ўборка ўраджаю. «Прыемны час у вас, хоць працы шмат, але калі ўраджай добры... — прывітаў супрацоўнікаў гаспадаркі Прэзідэнт. — Дзякуй вам вялікі. Вы для нас арыенцір. Будзем на вас раўняцца, каб беларусы з Польшчы яблыкі не завозілі і з іншых краін».

Валерыя СЦЯЦКО.

Маладзечанскі раён.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Шкода ад махлярства з крыптавалютамі ўзрасла да 5,6 мільярда долараў

Фінансавы ўрон ад махлярства з крыптавалютай вырас на 45 працэнтаў — да $5,6 млрд, піша Bloomberg са спасылкай на даклад ФБР. Часцей за ўсё злачынцы выкарыстоўвалі «крыпту» ў інвестыцыйных ашуканскіх схемах — на такія выпадкі прыпадала звыш 70 працэнтаў фінансавай шкоды. Яшчэ каля 10 працэнтаў прыйшлося на выпадкі, калі ашуканцы абтэлефаноўвалі сваіх ахвяр, прадстаўляючыся супрацоўнікамі дзяржарганізацый. За мінулы год амерыканскае ведамства атрымала 69,5 тысячы зваротаў, звязаных з крыптавалютным махлярствам у ЗША і за мяжой. Гэта толькі 10 працэнтаў ад усіх скаргаў на фінансавае махлярства ў цэлым, аднак на страты ў сегменце крыптавалют прыпадала амаль палова ўсёй шкоды ад дзеянняў ашуканцаў.

Boeing адправіць дзясяткі тысяч супрацоўнікаў у неаплатны водпуск

Амерыканская авіябудаўнічая карпарацыя Boeing адправіць дзясяткі тысяч супрацоўнікаў у неаплатны водпуск, каб змякчыць наступствы забастоўкі, у якой удзельнічае яе найбуйнейшы прафсаюз. Аб гэтым паведаміла газета The New York Times. Адзначаецца, што забастоўка рэзка запаволіла вытворчасць камерцыйных самалётаў. На гэтым тыдні карпарацыя абвясціла аб шэрагу мер па скарачэнні выдаткаў, каб прадухіліць страты, якія могуць скласці мільярды долараў у выпадку працяглай забастоўкі. Як заявіў выканаўчы дырэктар кампаніі Кэлі Ортберг, неаплатныя часовыя водпускі закрануць «вялікую колькасць кіраўнікоў, менеджараў-распарадчыкаў і супрацоўнікаў у ЗША». Раней The New York Times паведамляла, што працяг забастоўкі можа прывесці Boeing да страт у памеры не менш як $3 млрд. Супрацоўнікі Boeing патрабуюць павышэння аплаты працы. Прафсаюз дабіваецца, каб на працягу трох гадоў заробкі выраслі на 40 %.

Цэны на рыс у Японіі ўзняліся да найвышэйшага ўзроўню амаль за паўстагоддзя

У Японіі цэны на рыс у жніўні дасягнулі найвышэйшага з верасня 1975 года ўзроўню з-за дрэннага ўраджаю і высокага пакупніцкага попыту. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на Міністэрства па адміністрацыйных справах і камунікацыях краіны. Цэны на гэты прадукт выраслі на 28,3 працэнта ў параўнанні з паказчыкам таго ж месяца летась. Як паведамляе тэлеканал NHK, дэфіцыт тавару і рост яго кошту звязаны таксама з тым, што большасць японцаў імкнуцца рабіць запасы рысу на выпадак землетрасенняў і штармоў. Цэны на прадукты харчавання ўзняліся ў жніўні ў Японіі на 2,9 працэнта. Гэта звязваюць з падаражаннем шэрагу імпартных сельскагаспадарчых тавараў, а таксама ўплывам празмернай летняй спякоты.

Абмен вопытам

Эфектыўныя адказы на сучасныя выклікі

Найважнейшыя пытанні выбарчага працэсу абмеркавалі падчас Міжнароднага электаральнага форуму, які гэтымі днямі праходзіць у Мінску

У чацвер кіраўнікі выбарчых органаў дзяржаў — удзельніц СНД сустрэліся з Прэзідэнтам Беларусі, пасля чаго адбылося пасяджэнне Кансультатыўнага савета, старшынство ў якім перайшло да нашай краіны. Тэматычныя секцыі, панэльныя дыскусіі — удзельнікі форуму абмеркавалі ролю інстытутаў грамадзянскай супольнасці падчас удзелу ў выбарах, пытанні бяспекі і лічбавізацыі выбарчага працэсу, прававой асветы моладзі, механізмы абароны і нацыянальныя мадэлі забеспячэння электаральнага суверэнітэту.

Найбольш вострыя пытанні ўзнімаліся падчас пленарнага пасяджэння міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Міжнародныя стандарты ў выбарчым працэсе: вопыт і перспектывы развіцця», пляцоўкай для якой стала Нацыянальная бібліятэка. Сярод удзельнікаў — кіраўнікі і супрацоўнікі цэнтральных выбарчых органаў дзяржаў — удзельніц СНД, кіраўнікі дзяржаўных органаў, парламентарыі, прадстаўнікі міждзяржаўных структур, палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў, навукоўцы і студэнты.

Электаральны суверэнітэт і лічбавізацыя выбараў

Адкрываючы пленарнае пасяджэнне канферэнцыі, **старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Беларусі Ігар КАРПЕНКА** адзначыў, што свабодныя і справядлівыя выбары, якія забяспечваюць правы грамадзян на ўдзел у палітычным жыцці і фарміраванне органаў дзяржаўнай улады, з'яўляюцца нязменным атрыбутам дэмакратычнага грамадства. «Стандарты выбарчага працэсу іграюць ключавую ролю ва ўмацаванні даверу грамадства да выбараў, — падкрэсліў ён. — Сённяшні свет выстаўляе новыя патрабаванні да выбарчых сістэм, і наша задача — знайсці эфектыўныя адказы на сучасныя выклікі і выпрацаваць аптымальныя шляхі вырашэння праблем».

Міжнародная канферэнцыя акурат адкрывае новыя магчымасці для абмену ведамі, досведам і ідэямі, з'яўляецца платформай для адкрытай дыскусіі. Кіраўнік Цэнтрвыбаркама нашай краіны расказаў аб інстытуце выбараў у Беларусі, якому спаўняецца 35 гадоў, асаблівую ўвагу ўдзяліў працэсу фарміравання прававой базы правядзення выбараў і рэферэндумаў, што, па яго словах, стварыла аб'ектыўныя ўмовы для кадыфікацыі выбарчага заканадаўства суверэннай Беларусі.

Кажучы аб пытаннях, якія абмяркоўваліся падчас міжнароднай канферэнцыі (бяспека і лічбавізацыя выбарчага працэсу, удзел грамадзянскай супольнасці ў выбарах, прававая асвета моладзі), Ігар Карпенка акцэнтаваў увагу на тым, што актуальнасць гэтых тэм несумненная, бо ўсе яны разглядаюцца ў кантэксце забеспячэння электаральнага суверэнітэту. «Невыпадкова дадзенае паняцце знайшло адлюстраванне ў Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь як неад'емнае і выключнае права дзяржавы самастойна і незалежна арганізоўваць і праводзіць выбары, рэферэндумы ў мэтах забеспячэння рэалізацыі поўнаўладдзя народа і свабоды яго выбару пры вяршэнстве Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і нацыянальнага заканадаўства, недапушчэння ўмяшання ў выбарчы працэс, — канкрэтызаваў ён. — Захаванню і забеспячэнню электаральнага суверэнітэту будуць садзейнічаць прадугледжаныя законам паўнамоцтвы новага канстытуцыйнага органа — Усебеларускага народнага сходу як гаранта стабільнасці і грамадзянскай згоды ў краіне».

Звярнуў увагу старшыня ЦВК і на непазбежнасць інфарматызацыі выбарчага працэсу. Цэнтральная выбарчая камісія сумесна з зацікаўленымі распрацавала агульную канцэпцыю дзяржаўнай аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы «Выбары». «Тэхнічна развітая інфраструктура выбарчай сістэмы, безумоўна, дазваляе павысіць электаральную актыўнасць насельніцтва і празрыстасць выбарчага працэсу, — лічыць Ігар Карпенка. — Разам з тым укараненне розных інфармацыйных рашэнняў патрабуе глыбокага аналізу і прагназавання магчымых рызык з улікам уразлівасці лічбавых платформ і рэсурсаў, узнікнення праблем, выкліканых некарэктнай работай аўтаматызаваных сістэм. Нельга ігнараваць новыя выклікі, звязаныя з кібербяспекай і абаронай даных, выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій для спроб зрыву выбараў і скажэнні іх вынікаў».

Найважнейшы кампанент — палітычная культура грамадзян

Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Наталля ПЯТКЕВІЧ адзначыла, што цэнтральныя выбарчыя камісіі, як бы яны ні называліся, — гэта твар выбарчых кампаній. «Людзі, грамадства, трэба шчыра прызнаць, часта мяркуюць аб выбарчым працэсе, нават выбарчым заканадаўстве, менавіта па членах выбарчых камісій: давяраць-не давяраць і гэтак далей, — заўважыла яна. — І вельмі прыемна, што цэнтрвыбаркамы нашых братэрскіх краін маюць такія твары — высокаінтэлектуальныя, разумныя і мудрыя».

Наталля Пяткевіч звярнула ўвагу на падабенства краін Садружнасці. «Бо мы — дзяржавы з маладой дэмакратыяй, якая фарміруецца, але ўжо асмелілася кінуць выклік сусветным слупам і не прызнаваць за аксіёмы стандарты, якія існуюць, проста таму, што яны кімсьці калісьці ўстаноўлены і чамусьці прызнаны абавязковымі для прымянення ва ўсім свеце, — патлумачыла першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. — Мы падвергнулі іх крытычнаму аналізу і нават асмеліліся адкінуць тыя з іх, якія не падыходзяць пад індывідуальныя ўмовы кожнай канкрэтнай краіны, не адпавядаюць інтарэсам пэўнай дзяржавы і грамадства. Вядома, гэта не можа падабацца, не можа не раздражняць. Што рабіць? Вядома, працягваць у тым жа духу, бо толькі такі падыход адпавядае інтарэсам кожнай канкрэтнай дзяржавы і грамадства. Бо мы паказваем прыклад таго, што так можна, так працуе і так патрэбна».

Наталля Пяткевіч акцэнтавала ўвагу на тэме, якая, па яе меркаванні, з'яўляецца найбольш вострай і надзвычай важнай для краін СНД. «Гэта фарміраванне палітычнай культуры ў грамадстве, палітычнай культуры грамадзян, — канкрэтызавала яна. — Палітычная культура — гэта найважнейшы кампанент цэласнай асобаснай культуры. Дэмакратыі трэба вучыць. Трэба вучыць таму, што рэалізацыя палітычных правоў, у прыватнасці выбарчых — гэта не пагоня за абяцаннямі, лозунгамі толькі таму, што гэта ў трэндзе і нешта нестандартнае. Палітычныя правы грамадзян, удзел у выбарах — гэта перш за ўсё разумны, узважаны і, галоўнае, адказны ўдзел у рашэнні дзяржаўных спраў. І я бачу вялізную ролю менавіта цэнтральных выбарчых камісій у фарміраванні палітычнай культуры ў нашым грамадстве».

Міжнародныя стандарты і заканадаўчая база СНД

Аб міжнародных стандартах выбараў і практыцы іх прымянення ў дзяржавах — удзельніцах СНД расказаў **першы намеснік Генеральнага сакратара СНД Леанід АНФІМАЎ.** Па яго словах, з мэтай захавання магчымасці аказання ўплыву на палітычныя працэсы ў дзяржавах Садружнасці заходнія калегі імкнуцца захаваць за сабой магчымасць кантролю над інстытутам міжнароднага назірання. «Дзяржавы падзяляюць на дзве катэгорыі: для адных ацэнкі правядзення выбараў апрыёры станоўчыя, пры любых умовах іх выбарчыя кампаніі ацэньваюцца як адпаведныя міжнародным дэмакратычным стандартам, — заўважыў ён. — Іншыя атрымліваюць ацэнку ў залежнасці ад палітычных вынікаў выбараў. Мы лічым гэта недапушчальным. Для нас непрымальная практыка, калі нейкія кулуарна распрацаваныя экспертныя рэкамендацыі, зацверджаныя асобнымі міжнароднымі арганізацыямі, з'яўляюцца асновай для ацэнкі выбараў. Мы зыходзім з таго, што падыходы да назірання за выбарамі павінны быць адзінымі, максімальна канкрэтнымі і адназначнымі, не дапускаць іх двухсэнсоўнай трактоўкі. Пры гэтым галоўнай мэтай міжнародных назіральнікаў павінна з'яўляцца забеспячэнне ўмоў свабоднага, незалежнага выбару грамадзянамі сваёй будучыні».

Кажучы аб падыходах да манітарынгу выбараў у Садружнасці, Леанід Анфімаў адзначыў створаную сур'ёзную заканадаўчую базу, на якую абапіраюцца краіны СНД, ацэньваючы электаральныя працэсы. «Многім з вас, як і мне, давялося ўдзельнічаць у назіранні за выбарамі ў дзяржавах СНД, і найперш павінен адзначыць, што відавочны несумненны прагрэс як у падрыхтоўцы, так і ў правядзенні выбарчых кампаній, — падкрэсліў першы намеснік Генсакратара СНД. — Актыўна ідзе працэс удасканалення выбарчых сістэм краін Садружнасці. Укараняюцца новыя тэхналогіі, новае абсталяванне, новыя падыходы да працэдуры галасавання, ствараюцца дадатковыя магчымасці для выбаршчыкаў узяць у ім удзел. Значна ўмацаваліся дэмакратычныя прынцыпы ў арганізацыі выбараў. Ва ўсіх краінах удасканальваецца выбарчае заканадаўства ў напрамку яго лібералізацыі. Гэта забяспечвае адкрытасць і празрыстасць выбараў, а самае галоўнае — гарантуе свабоду волевыяўлення грамадзян».

Нацыянальныя заканадаўствы краін Садружнасці адпавядаюць агульнапрынятым нормам правядзення свабодных і адкрытых выбараў. У іх змяшчаюцца такія стандарты дэмакратычных выбараў, як права грамадзяніна выбіраць і быць выбраным, адкрыты і галосны характар выбараў, ажыццяўленне судовай і іншай абароны выбарчых правоў грамадзяніна, грамадскае і міжнароднае назіранне за выбарамі, гарантыі рэалізацыі выбарчых правоў і свабод удзельнікаў выбарчага працэсу. Замацаваны прынцыпы справядлівасці, сапраўднасці і свабоды выбараў на аснове ўсеагульнага роўнага выбарчага права пры тайным галасаванні, якія забяспечваюць свабоду волевыяўлення выбаршчыкаў. Акрамя таго, ва ўсіх краінах Садружнасці заканадаўча замацаваны інстытут міжнароднага назірання. «Таму спасылкі на тое, што законы аб выбарах у краінах СНД не адпавядаюць агульнапрызнаным нормам правядзення дэмакратычных выбараў, мякка кажучы, некарэктныя», — рэзюмаваў Леанід Анфімаў.

Урокі вынесены — дзейнічаем

Аб выкарыстанні медыятэхналогій у выбарчым працэсе на прыкладзе беларускага вопыту расказаў **міністр інфармацыі Беларусі Марат МАРКАЎ.** Кіраўнік ведамства адзначыў, што медыйныя і палітычныя тэхналогіі вельмі моцна ўзаемазвязаны паміж сабой, асабліва ў перыяд выбарчых кампаній. «З развіццём тэхналогій медыяпейзаж выбарчага працэсу церпіць значныя змяненні, — паведаміў ён. — Новыя медыятэхналогіі не толькі мяняюць спосабы камунікацый паміж кандыдатамі і выбаршчыкамі, але і ўплываюць на самую прыроду выбараў. Мы з вамі бачылі дастаткова паспяховых каляровых рэвалюцый у суседзяў і грандыёзны заходні правал у Беларусі ў 2020 годзе. Хаця менавіта на нас быў накіраваны несуразмерны краіне, колькасці жыхароў, рэальнай сітуацыі інструментарый, які быў шчодра падсілкаваны фінансава».

Улічваючы беларускі вопыт, міністр інфармацыі прапаноўвае ўвесці тэрмін «медыяпалітычныя тэхналогіі ўплыву на выбарчы працэс». «У інфармацыйнай прасторы на выбаршчыкаў у 2020 годзе ўплывалі і тэлебачанне разам з іншымі традыцыйнымі СМІ, і шматлікія інтэрнэт-рэсурсы, у першую чаргу сацыяльныя сеткі і месенджары, якія сыгралі важную ролю ў арганізацыі пратэстаў і мабілізацыі так званых «калябантаў» (у частцы мяккага электарату найбольш схільныя тэхналогіі эмацыянальнага ўздзеяння), — патлумачыў Марат Маркаў. — Выкарыстанне хэштэгаў, прамых трансляцый, фэйкавых навін, фота і відэаролікаў дазволіла стварыць магутную інфармацыйную плынь, якая падтрымлівала пратэсны настрой. Гэта важна прызнаць і ў ніякім разе нельга ігнараваць».

Міністр расказаў, што ў 2020 годзе было зарэгістравана звыш 8 мільёнаў інтэрнэт-карыстальнікаў. З іх практычна 2,5 мільёна — гэта актыўныя карыстальнікі Telegram. «На піку майданнай актыўнасці Украіну гайдалі 150-200 тысяч актывістаў і «калябантаў», — нагадаў ён. — Гэтага было дастаткова, каб перавярнуць саракамільённую краіну».

Для таго, каб ісці наперад і не аступацца, па меркаванні Марата Маркава, трэба ўмець выносіць урокі і прызнаваць памылкі. «Да 2020 года мы былі вельмі даверлівымі і вельмі цяплічнымі, вельмі талерантнымі, — канстатаваў кіраўнік ведамства. — Мы саромеліся абараняць сваю медыяпрастору і прымаць адэкватныя заканадаўчыя нормы, якія абаранілі б наш інфармацыйны суверэнітэт. І не дазволілі б распаліцца тысячам экстрэмісцкіх рэсурсаў і сотням прадажных медыйшчыкаў. Высновы зроблены».

У прыватнасці, нягледзячы на крытыку, айчыннае тэлебачанне нарасціла сваю значнасць. Гэта пацвярджаецца павышэннем рэйтынгаў грамадска-палітычных перадач. У цэлым за два гады (2021—2023 гг.) давер да дзяржаўных СМІ, па словах міністра інфармацыі, вырас на 55 % з 38 %. Пры гэтым давер да недзяржаўных СМІ за гэты ж перыяд з 12,5 % знізіўся ў тры разы. Напярэдадні прэзідэнцкай выбарчай кампаніі 2025 года ўпершыню ў суверэннай гісторыі Беларусі ўведзены два новыя інструменты. Днямі ў эфіры з'явіўся кругласутачны інфармацыйны канал «Першы інфармацыйны» ў сукупнасці з парталам «news. by», пачала сваю работу і першая ў краіне мультымедыйная платформа VIDEOBEL.BY, якая дазволіць абараніць кантэнт рэспубліканскіх СМІ ад капрызаў замежных хостынгаў.

Вераніка КАНЮТА.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Наталля САХАРЧУК:

«МІЛІЦЫЯ ЦЯПЕР АДКРЫТАЯ ЯК НІКОЛІ»

Падраздзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў органаў унутраных спраў адзначаюць 40-годдзе з дня ўтварэння

Сёння складана ўявіць любое падраздзяленне міліцэйскага ведамства — ці то Дэпартамент аховы, ці то Дзяржаўтаінспекцыя або ўнутраныя войскі — без прэс-службы. Дзякуючы прэс-афіцэрам наладжана ўзаемадзеянне журналістаў з супрацоўнікамі органаў унутраных спраў, у выніку якога міліцэйская тэматыка прысутнічае ва ўсіх медыя, а вартавыя права-парадку знаходзяцца побач з людзьмі.

Фота прэс-службы МУС.

Высокую ацэнку рабоце падраздзяленняў інфармацыі і грамадскіх сувязяў Міністэрства ўнутраных спраў даў кіраўнік міліцэйскага ведамства. Падчас урачыстага мерапрыемства з нагоды 40-годдзя медыяслужбы Іван Кубракоў адзначыў, што гэта адно з самых аператыўных і перадавых падраздзяленняў МУС. «Яго супрацоўнікі ў любы час сутак выязджаюць на месца здарэння, здымаюць, перадаюць інфармацыю, працуюць у мароз, спякоту, дождж, — канкрэтызаваў ён. — Штодзень, вывучаючы зводкі аб злачынствах, правапарушэннях, даю ўказанні не толькі супрацоўнікам, якія непасрэдна адказваюць за канкрэтны кірунак, але і прэс-службе, каб спрафілактаваць пэўную сітуацыю. А для гэтага трэба правільна данесці інфармацыю, каб кожны чалавек зразумеў, як паступіць у тым ці іншым выпадку. І дзякуючы такой інфармацыі выратавана нямала жыццяў, захавана маёмасць грамадзян». Заслуга прэс-службы, па словах міністра, і ў зніжэнні злачыннасці па ўсіх кірунках, у інфармацыйным супрацьборстве.

Што канкрэтна за гэтым стаіць, а таксама як фарміруецца інфармацыйная палітыка міліцэйскага ведамства, карэспандэнту «Звязды» расказала начальнік управлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў Міністэрства ўнутраных спраў палкоўнік міліцыі Наталля Сахарчук.

«У нас ёсць усё для таго, каб рабіць якасны кантэнт»

— Наталля Міхайлаўна, што ўяўляе сабой управленне, якое вы ўзначальваеце?

— З улікам таго, што міліцыі — больш як стагоддзе, управленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў — гэта дастаткова маладая служба. Аднак яе гісторыя напоўнена шматлікімі падзеямі, дачыненне да якіх мае вялікая колькасць людзей. Падраздзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў — гэта адзіная магутная сістэма, якая працуе 24/7. Уяўляю, як нашаму паважанаму ветэрану Сяргею Ціванову, які закладваў фундамент усёй сістэмы, прышлося цяжка. Не было тых тэхнічных сродкаў і магчымасцяў, якімі мы валодаем сёння. Першы прэс-сакратар МУС расказваў, што спачатку ён пісаў сцэнарый сюжэта, потым здымаў яго, браў каментарый, сам манціраваў, запісваў на касету, пасля чаго ляцеў на тэлебачанне, каб зняты сюжэт трапіў у эфір, — і ўсё гэта рабіў адзін! Таму аб аператыўнасці нават размовы ісці не магло, але і часы былі абсалютна іншымі. А цяпер, як кажа кіраўнік дзяржавы, час выбраў нас, і мы абавязаны адпавядаць сучасным тэндэнцыям у інфармацыйным полі. І робім гэта. У нас каласальная падтрымка кіраўніцтва Міністэрства ўнутраных спраў. Мы абсталяваны тэхнікай апошняга пакалення, ёсць усё для таго, каб рабіць якасны кантэнт.

— Пры гэтым міліцэйскае ведамства шчыльна ўзаемадзейнічае са сродкамі масавай інфармацыі. Якім з іх аддаяце перавагу?

— Міліцыя прысутнічае ў кожным сегменце. Нягледзячы на тое, што цяпер практычна ўсё сышло ў інтэрнэт, мы цудоўна разумеем, што ёсць аўдыторыя, якая чытае перыядычныя выданні. У абавязковым парадку міліцэйская тэматыка прысутнічае на тэлебачанні: у нас ёсць свае рубрыкі, перадачы. Супрацоўнікі органаў унутраных спраў рэгулярна бяруць удзел у прамых эфірах на радыё. Ёсць шэраг сваіх праграм, асабліва ў рэгіёнах, дзе мясцовыя радыёстанцыі карыстаюцца папулярнасцю ў насельніцтва. Як толькі пачаўся працэс раскруткі месенджараў і сацыяльных сетак, мы цудоўна разумелі, што і там мы павінны прысутнічаць. У кожным абласным упраўленні ўнутраных спраў існуюць свае тэлеграм-каналы, але ўсе яны прытрымліваюцца інфармацыйнай палітыкі ведамства, дзе самае галоўнае — гэта аператыўнасць і дакладнасць.

— Падпісчыкі тэлеграм-канала МУС аднымі з першых даведваюцца аб падзеях, якія адбываюцца ў ведамстве. Там вельмі шмат і прафілактычнай інфармацыі, якая дапамагае не трапіць у бяду...

— Тэлеграм-канал ведамства — асноўная крыніца давядзення аператыўнай інфармацыі да нашых людзей. Калі мы пачынаем вучэнне ў Століне, то загадзя папярэджваем аб гэтым людзей. Гэта робіцца як з інфармацыйнай (каб людзі разумелі, што ніякай вайны няма, ідзе вучэнне), так і з прафілактычнай мэтай (каб грамадзяне планавалі свае маршруты з улікам атрыманай інфармацыі). У тым ліку праз тэлеграм-канал мы паказваем людзям, што гатовы да любых выклікаў і пагроз, кажам аб тым, каб людзі спалі спакойна, бо краіна знаходзіцца пад абаронай. Затрымалі забойцу — гаворым аб гэтым. Арыштавалі педафіла — таксама паведамляем. І абсалютна не для піяру. Самае галоўнае — прафілактыка. Паказваем, што ў гэтым кірунку робіць міліцыя, заклікаем бацькоў звяртаць увагу на паводзіны сваіх дзяцей, каб яны не трапілі ў бяду. Як кажа кіраўнік нашага ведамства, злачынства лепш спрафілактаваць, чым потым раскрываць. Інфармацыю аб ідэалагічных мерапрыемствах таксама транслюем загадзя — такім чынам запрашаем людзей, каб яны прыйшлі і разам з намі раздзялілі наша свята. Напрыклад, дзякуючы Івану Кубракову была праведзена вялікая работа па рэканструкцыі мемарыяльнага комплексу капітана Уладзіміра ў Магілёўскім раёне. Калі комплекс адкрываўся, мы запрашалі ўсіх аховных туды прыехаць. Калі арганізоўвалі «Цягнік памяці» ў Брэсце, таксама запрашалі ўсіх з сабой, каб людзі памяталі сваю гісторыю і былі бліжэйшымі да міліцыі. Апошнім часам вельмі шмат людзей наведвае мерапрыемствы, акцыі з удзелам Міністэрства ўнутраных спраў. Тут можна напрамую пагаварыць з міністрам, паціснуць яму руку, сфатаграфавацца. Міліцыя цяпер адкрытая як ніколі.

— Ці можна казаць аб тым, што на гэта паўплываў 2020 год?

— Вядома, але не толькі. Прыйшоў новы кіраўнік ведамства — змянілася і інфармацыйная палітыка. Што датычыцца падзей 2020 года, як казаў наш міністр, мы тады прайгралі інфармацыйную вайну. Аднак не памыляецца той, хто нічога не робіць. Ёсць вопыт, які мы прааналізавалі і зрабілі пэўныя высновы. Ды і нашы людзі пасля 2020 года сталі іншыя. Яны шануюць мір, бяспеку і парадак. Давайце глядзець праўдзе ў вочы: на тэрыторыі Беларусі можна спакойна хадзіць вечарам і не баяцца за дзяцей, якія гуляюць на вуліцы.

«Няма мяжы ўдасканаленню, самаўдасканаленню і самаразвіццю»

— Колькі падпісчыкаў у тэлеграм-канала МУС?

— З моманту змянення інфармацыйнай палітыкі нашага ведамства колькасць падпісчыкаў выросла. На цяперашні момант мы падыходзім да лічбы ў 50 тысяч. Гэта заслуга ўсіх супрацоўнікаў сістэмы МУС і нашых паважаных падпісчыкаў — значыць, нас цікава глядзець, чытаць, значыць, мы сапраўды знайшлі сваю нішу і ўяўляем цікавасць для людзей. Мы можам працаваць і ў чатыры гадзіны раніцы, і ў 10 гадзін вечара, і ў 12 ночы. Нядаўна на наш адрас прыйшло афіцыйнае апавяшчэнне, у якім сказана, што ў сегменце права тэлеграм-канал Міністэрства ўнутраных спраў — нумар адзін.

— Ці так жа паспяхова ідуць справы ў іншых сацыяльных сетках?

— Усе сацыяльныя сеткі МУС, у тым ліку рэгіянальныя, на цяперашні момант маюць амаль мільён падпісчыкаў. Колькі б нас ні банілі ў Instagram, мы працягваем работу. Мы цудоўна разумеем, хто супраць нас працуе. Нашы апаненты не хочуць, каб мы паказвалі людзям тое, што адбываецца на самай справе. Згодна з сацыялагічнымі даследаваннямі, самай папулярнай сацсеткай у нашай краіне з'яўляецца TikTok. Улічваючы гэта, мы перафарматаваліся, і на цяперашні момант колькасць падпісчыкаў нашага акаўнта складае звыш 100 тысяч. Там пастаянна размяшчаецца эксклюзіўны кантэнт, асабліва з удзелам міністра ўнутраных спраў. Праводзіцца работа і ў Facebook, добра раскручаны «ВКонтакте» і X (былы Twitter). Мы прысутнічаем усюды — і ўсюды ў нас свая мэтавая аўдыторыя. Мы расцём, развіваемся, каб ні на адну секунду не выпасці з інфармацыйнага поля. Для таго, каб адпавядаць сучасным патрабаванням, нашы супрацоўнікі пастаянна праходзяць навучанне. Няма мяжы ўдасканаленню, самаўдасканаленню і самаразвіццю.

— Сайт ведамства ўжо не канкурыруе з сацыяльнымі сеткамі?

— Практычна шэсць гадоў таму была створана адзіная інфармацыйная сістэма сайта Міністэрства ўнутраных спраў. Дзякуючы сайту людзі могуць даведацца, як напісаць заяву, зварот у міліцыю, скласці іншы дакумент — гэта інфармацыйная крыніца. Вельмі вялікая колькасць ідзе падзяк у адрас супрацоўнікаў міліцыі. Дзякуючы каментарыям, мы бачым настрой людзей і цудоўна разумеем, у якім кірунку трэба працаваць. Дзякуючы і сайту, і сацыяльным сеткам, у нас ёсць зваротная сувязь з аўдыторыяй: людзі задаюць пытанні, прапаноўваюць арганізаваць сумесныя прафілактычныя мерапрыемствы, некаторыя просяцца, каб іх узялі на работу ў прэс-службу МУС.

— Каму аддаяце прыярытэт — міліцыянерам або журналістам?

— Прафесіяналам. Не ўсе журналісты могуць быць міліцыянерамі, а не ўсе міліцыянеры — журналістамі. Ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў служаць людзі і з журналісцкай адукацыяй, і з юрыдычнай, педагагічнай, іншай. У кожнай прэс-службе як мінімум ёсць чалавек з журналісцкай адукацыяй. Журналісцкая адукацыя — гэта цудоўна, але калі чалавек не ведае асаблівасцяў міліцэйскай службы, яму будзе няпроста. Мы з задавальненнем бяром на работу тых журналістаў, якія, напрыклад, працавалі ў раённай газеце і асвятлялі міліцэйскую тэматыку: яны разбіраюцца ў тонкасцях службы. Калі чалавек хоча працаваць, у яго гараць вочы, то ўсё атрымаецца — і няважна, якую адукацыю ён мае.

«Увагу і давер людзей заваявалі дзяржаўныя крыніцы інфармацыі»

— Ці патрэбна рэагаваць на фэйкі?

— На любыя інфармацыйныя ўкіды трэба рэагаваць правільна. На сённяшні момант у нас дастаткова сіл і сродкаў, каб працаваць у гэтым кірунку. Апошнім часам нашы апаненты, ужо не маючы ніякай інфармацыйнай нагоды, пачынаюць нешта высмоктваць з пальца. Не на ўсё трэба звяртаць увагу. Нашы людзі стаміліся ад ілжывай інфармацыі «опа-памыйніц». Самы галоўны паказчык — тое, што ад гэтых рэсурсаў адпісваецца вялікая колькасць людзей. Пасля таго, як перафарматавалася работа СМІ і прэс-службаў ведамстваў, увагу і давер людзей заваявалі дзяржаўныя крыніцы інфармацыі, бо расказваюць аб падзеях праўдзіва і аператыўна.

— Што выбераце, калі стаіць пытанне даць інфармацыю аператыўна, але недакладна, або падрабязна, але не хутка?

— Мы ніколі не выстаўляем непраўдзівую інфармацыю. Напрыклад, адбылося ДТЗ, пацярпелі людзі, але мы пакуль не ведаем, хто вінаваты ў гэтай сітуацыі. У такім выпадку інфармацыя падаецца так, каб заявіць аб факце, але нікога не пакрыўдзіць. Мы не можам дапусціць страты даверу да міліцыі з боку нашых грамадзян. А з улікам таго, што цяпер ён вельмі высокі, не маем права зрабіць хоць адну памылку. Так, ёсць здаровая канкурэнцыя паміж ведамствамі, але калі ты не ўпэўнены або нічога не ведаеш, то лепш увогуле нічога не гаварыць.

— На вашых інфармацыйных рэсурсах нярэдка на сувязь з аўдыторыяй выходзяць супрацоўнікі крымінальнага вышуку, упраўленняў па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці, іншыя спецыялісты. З чым гэта звязана?

— Інфармацыйная палітыка ведамства не будуецца на зводцы. Ёсць аналітыка, сезоннасць, іміджавы і ідэалагічны складнікі — усё павінна працаваць у комплексе. Міліцыя шматаблічная. А таму не павінен выходзіць адзін прэс-сакратар і выступаць на розныя тэмы. Правільна, калі па кожным кірунку інфармацыю даносіць профільны спецыяліст. Калі мы разумеем, што ідзе рост кіберзлачынстваў, праінфармуем аб гэтым і дадзім рэкамендацыі, як не стаць ахвярай. І ніхто гэта не зробіць лепш за супрацоўніка Галоўнага ўпраўлення па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці. Так і супрацоўнік ДАІ, які найбольш дасведчаны ў гэтай тэме, больш кампетэнтна здольны паведаміць удзельнікам дарожнага руху іх правы і абавязкі.

— Наталля Міхайлаўна, наколькі складана кіраваць такім шматгранным і вялікім калектывам? Дзе знаходзіце сілы працаваць у рэжыме нон-стоп?

— Мы сапраўды працуем у рэжыме 24/7. Але калі ёсць падтрымка родных і блізкіх, кіраўніцтва ведамства і асабовага складу, які гатовы з табой працаваць у такіх умовах, як бы цяжка ні было, гэта дае сілы і жаданне рухацца наперад, рэалізоўваць вялікія праекты, якія не толькі звязаны са СМІ. Людзі гатовы працаваць суткамі толькі для таго, каб у нас быў мір. Ці лёгка кіраваць такім вялікім калектывам? Не зусім. Усе людзі розныя, але задача кіраўніка — знаходзіць падыход да кожнага супрацоўніка. У падраздзяленнях інфармацыі і грамадскіх сувязяў працуюць прафесіяналы, ідэалагічна вывераныя супрацоўнікі, сапраўдныя патрыёты. У мяне самы лепшы калектыў. Хачу падзякаваць усім за плённае ўзаемадзеянне, пажадаць бясконцай энергіі, каб і далей мы былі лідарамі ў інфармацыйным парадку дня.

Вераніка КАНЮТА.

Супрацоўніцтва

Арыенцір на шляху да законапаслухмянасці

Узаемадзеянню Беларускай праваслаўнай царквы і ўстаноў крымінальна-выканаўчай сістэмы — 30 гадоў

На працягу трох дзесяцігоддзяў свяшчэннаслужыцелі Беларускай праваслаўнай царквы дапамагаюць людзям, якія пераступілі рысу закона, усвядоміць свой злачынны ўчынак і стаць на шлях выпраўлення. Ва ўсіх папраўчых установах і лячэбна-працоўных прафілакторыях узведзены храмы або абсталяваны памяшканні для малітвы, вядзецца асветніцкая работа, рэалізоўваюцца адукацыйныя праграмы духоўна-маральнай накіраванасці.

Узаемадзеянне БПЦ і ўстаноў крымінальна-выканаўчай сістэмы Міністэрства ўнутраных спраў дае свой плён: пасля адбыцця пакарання чалавек вядзе законапаслухмяны лад жыцця. Аб гэтым сведчыць статыстыка: колькасць рэцыдыўных злачынстваў з кожным годам скарачаецца. Аб гэтым, а таксама іншых поспехах духоўна-маральнага выхавання ў папраўчых установах гаварылі падчас канферэнцыі, прысвечанай 30-годдзю ўзаемадзеяння Дэпартамента выканання пакаранняў МУС і Беларускай праваслаўнай царквы. Праваахоўнікі і свяшчэннаслужыцелі падзяліліся вопытам са сваімі калегамі з іншых краін, вызначылі кірункі далейшага ўдасканалення такога ўзаемадзеяння.

ВЫКЛЮЧНА ПА ЖАДАННІ

Як расказаў **намеснік начальніка Дэпартамента выканання пакаранняў — начальнік упраўлення арганізацыі папраўчага працэсу Уладзіслаў МАНДРЫК,** трапляючы ў месца пазбаўлення волі, асуджаны адчувае шэраг перажыванняў з нагоды здзейсненага злачынства, тэрміну адбывання пакарання, спынення зносін з сям'ёй, расставання з дзецьмі і гэтак далей. «Прысутнасць ва ўстановах крымінальна-выканаўчай сістэмы праваслаўных абшчын пры храмах дапамагае знайсці ў коле такіх жа асуджаных спачуванне, што дапаможа гэты этап перажывання перанесці, — адзначыў ён. — Храм дапаможа яму пераадолець перыяд адаптацыі, набыць новыя маральныя чалавечыя якасці, якія прыйдуць узамен тым негатыўным, якія сфарміравалі яго злачынны лад жыцця да асуджэння».

Пры гэтым праца свяшчэннаслужыцеляў у папраўчых установах не абмяжоўваецца выключна правядзеннем праваслаўных абрадаў і індывідуальнымі размовамі з асуджанымі. Установамі крымінальна-выканаўчай сістэмы зроблены якасны крок наперад. Ужо два наборы асуджаных (а гэта каля 300 чалавек) дыстанцыйна прайшлі багаслоўскія курсы пры Жыровіцкім манастыры. У планах — набраць трэці курс. Акрамя таго, асуджаныя дыстанцыйна навучаюцца ў Мінскім духоўным вучылішчы. Плануецца, што ў наступным годзе яны будуць атрымліваць адукацыю па кірунку «Катэхізатарская работа».

Па словах Уладзіслава Мандрыка, і да навучання багаслоўскім курсам пры Жыровіцкім манастыры, і да засвоення адпаведнай праграмы ў Мінскім духоўным вучылішчы прыцягваюцца тыя людзі, якія, па меркаванні кіраўніцтва папраўчых устаноў, вярнуўшыся ў грамадства, будуць весці правапаслухмяны лад жыцця. Пры гэтым немалаважная дэталь — жаданне навучацца самога асуджанага.

«У папраўчых установах ёсць царква, абшчына, дзе працуе свяшчэннік, які ўдзельнічае ў калектыўных мерапрыемствах з асуджанымі, выступае на праваслаўныя святы, — тлумачыць намеснік начальніка Дэпартамента выканання пакаранняў — начальнік упраўлення арганізацыі папраўчага працэсу. — Асуджаныя бачаць гэта. І калі ў іх дома фарміруецца патрэба, яны звяртаюцца да нашых службовых асоб, якія арганізоўваюць іх удзел ва ўсіх мерапрыемствах».

«ПЕРШАРАДНАЕ ЗНАЧЭННЕ — ВЕРА ЧАЛАВЕКА»

Епіскап Нясвіжскі Аўксенцій, вікарый Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі звярнуў увагу на тое, што за гады ўзаемадзеяння Беларускай праваслаўнай царквы і Дэпартамента выканання пакаранняў МУС зроблена вельмі многае. Па яго словах, станоўчыя моманты сведчаць аб тым, што ёсць двухбаковая зацікаўленасць у гэтым служэнні.

«Для таго, каб кагосьці вучыць, маральна настаўляць, трэба самому валодаць гэтымі якасцямі, — лічыць епіскап Аўксенцій. — Да турэмнага служэння ў нашай Беларускай праваслаўнай царкве прыцягваюцца менавіта тыя бацюшкі, якія гэтымі якасцямі валодаюць. Доказам з'яўляецца тое, што практычна ва ўсіх установах гэтай сістэмы ёсць капліцы, цэрквы, у якіх здзяйсняецца боская літургія, акармляюцца насельнікі гэтых устаноў. Задача святара і супрацоўнікаў папраўчых устаноў — наставіць на шлях ісціны, каб чалавек, які пабыў у папраўчай установе, не вярнуўся сюды ніколі».

Кажучы аб эфектыўнасці ўплыву духоўнага выхавання на асоб, якія здзейснілі злачынства, **выконваючы абавязкі старшыні Сінадальнага аддзела па турэмным служэнні Маскоўскага патрыярхата іерэй Кірыл** працытаваў выказванне Найсвяцейшага Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла, які падчас наведвання аднаго са следчых ізалятараў Масквы сказаў, што адным дысцыплінарным уздзеяннем, аднымі рашоткамі, законамі і патрабаваннямі чалавека немагчыма выправіць. Па словах патрыярха, неабходна пераадолець самую вялікую праблему — стан розуму і сэрца, які прыводзіць да здзяйснення злачынстваў.

«Сапраўды, каб чалавек выправіўся, па-першае, ён павінен пераасэнсаваць сваё мінулае жыццё, па-другое, знайсці духоўныя сілы для новага законапаслухмянага жыцця, — падкрэсліў іерэй Кірыл. — І тут першараднае значэнне мае вера чалавека. Вера перш за ўсё адкрывае чалавеку духоўныя законы жыцця. Чалавек пачынае ў поўнай меры ўсведамляць, што злачынны шлях раней ці пазней заканчваецца не дабрабытам, а трагедыяй. З гэтага духоўнага закона не бывае выключэнняў. Тысячагадовы вопыт царквы сведчыць аб тым, што выпраўленне чалавека сапраўды магчыма, хаця часта гэта доўгі і няпросты шлях. У сувязі з гэтым натуральным і арганічным з'яўляецца ўзаемадзеянне крымінальна-выканаўчай сістэмы з рэлігійнымі арганізацыямі. Лічу, што па-за гэтым узаемадзеяннем наўрад ці можа быць дасягнута галоўная мэта крымінальна-выканаўчага заканадаўства нашых дзяржаў — выпраўленне асуджаных».

«Ідэальны стан для пенітэнцыярнай сістэмы — калі чалавек, які ўчыніў злачынства, пасля прызначанага судом тэрміну выходзіць са сцен пенітэнцыярных устаноў поўнасцю выпраўлены, з добрымі, здаровымі думкамі, з божай верай, напэўна, як страшны сон згадваючы тое, што ён калісьці зрабіў, адбываў у нас пакаранне».

ШЭРАГІ РЭЦЫДЫВІСТАЎ РАДЗЕЮЦЬ

Начальнік Дэпартамента выканання пакаранняў МУС генерал-маёр міліцыі Алег МАТКІН выказаў удзячнасць Беларускай праваслаўнай царкве за тое, што на працягу 30 гадоў свяшчэннаслужыцелі дапамагалі органам унутраных спраў выконваць гэту няпростую місію. Па словах кіраўніка падраздзялення, ён спакойны за тыя ўстановы, дзе ёсць храм, дзе прысутнічае свяшчэннік і мае зносіны з падапечнымі крымінальна-выканаўчай сістэмы.

«Ідэальны стан для пенітэнцыярнай сістэмы — калі чалавек, які ўчыніў злачынства, пасля прызначанага судом тэрміну выходзіць са сцен пенітэнцыярных устаноў поўнасцю выпраўлены, з добрымі, здаровымі думкамі, з божай верай, напэўна, як страшны сон згадваючы тое, што ён калісьці зрабіў, адбываў у нас пакаранне, — падкрэсліў Алег Маткін. — Вядома, не з усімі нашымі падапечнымі такога выніку дасягаем. Але тэндэнцыя па напаўняльнасці нашых устаноў сведчыць аб тым, што мы на правільным шляху і нашы вынікі станоўчыя».

Папраўчыя ўстановы дзеляцца на дзве катэгорыі: для асоб, якія ўпершыню адбываюць пакаранне, і для асоб, якія раней пакаранне адбывалі, — так званых рэцыдывістаў. Алег Маткін звярнуў увагу на тое, што памяншаецца колькасць спецкантынгенту ва ўстановах для асоб, якія раней адбывалі пакаранне. «Мы нават летась цэлую калонію для такіх асоб скарацілі. Вось гэта і ёсць наш сумесны вынік», — рэзюмаваў начальнік Дэпартамента выканання пакаранняў.

У канферэнцыі ўдзельнічаў і **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Палаты прадстаўнікоў Аляксандр БАРСУКОЎ,** які ў свой час узначальваў Дэпартамент выканання пакаранняў. Яму ёсць з чым параўноўваць, а таму тая работа, якая праводзіцца праваахоўнікамі сумесна з Беларускай праваслаўнай царквой, па меркаванні дэпутата, заслугоўвае глыбокай павагі.

Па словах парламентарыя, скарачэнне колькасці злачынстваў, здзейсненых асобамі, якія прыцягваліся да крымінальнай адказнасці, звязана з тым, што кожны на сваім узроўні робіць асабісты ўнёсак у прафілактыку крымінальна-пакаральных дзеянняў. «Тое, што сёння ў любы час дня і ночы можна выйсці на вуліцу, у тым ліку ў Мінску, — вялікая заслуга і нашай Беларускай праваслаўнай царквы, — адзначыў Аляксандр Барсукоў. — Вялікі вам дзякуй, нізкі паклон. Відаць нашу сумесную работу».

Па меркаванні дэпутата, людзей, якія знаходзяцца ў папраўчых установах, трэба акружыць клопатам і ўвагай і тады, калі яны ўжо акажуцца на волі. І канкрэтныя прапановы былі агучаны падчас канферэнцыі, дзе выступілі прадстаўнікі шматлікіх канфесій і дзяржаўных органаў. Усе выступоўцы прыйшлі да высновы, што важнасць узаемадзеяння Беларускай праваслаўнай царквы і ўстаноў крымінальна-выканаўчай сістэмы нельга пераацаніць, а таму супрацоўніцтва ў гэтым кірунку будзе працягвацца, каб законапаслухмяных грамадзян пасля адбыцця пакарання станавілася яшчэ больш.

Вераніка КАНЮТА.
Фота прэс-службы Дэпартамента выканання пакаранняў.

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор аукциона)
извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства

Аукцион состоится **09.10.2024 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Лот № 1: Капитальное строение с инв. № 500/С-34648.

Согласно ведомости технических характеристик:
наименование – нет сведений;
назначение – не соответствует фактическому назначению;
площадь – 1819,7 кв. м;
составные части и принадлежности: навес.
Адрес: г. Минск, пр-т Независимости, 58Г.

Обременение:
1. В отношении капитального строения с инв. № 500/С-34648 имеется действующий договор аренды.
2. Арест (постановление следователя от 17.03.2023 № б/н).

Начальная цена – 7 111 692,00 руб. Задаток – 711 169,20 руб.

Капитальное строение с инв. № 500/С-34648 расположено на земельном участке 500000000008003534 площадью 0,1082 га.

Целевое назначение:
земельный участок для эксплуатации и обслуживания здания производственного корпуса № 8.
Право аренды с 23.02.2011 по 30.11.2049.

Шаг аукциона – 5 %.

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 % (далее – Претендент на покупку), – обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня проведения аукциона. Указанный срок перечисления денежных средств Победителем аукциона (Претендентом на покупку) может быть на основании его письменного ходатайства однократно продлен, но не более чем на 20 рабочих дней.

2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона.

3. Переход права собственности на приобретённый на аукционе Объект недвижимости осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Регламентом о порядке организации и проведения аукционов РУП «Институт недвижимости и оценки» от 29.07.2024.

Порядок проведения аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7 в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00. Окончание приема заявлений – 07.10.2024 в 11.00.

Контактное лицо для осмотра Объекта – Игнатов Иван Владимирович +375 (17) 354-53-70, +375 (29) 640-92-76.

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего
ОАО «Минский Агросервис» (Продавец)

Электронные торги состоятся 25.10.2024.

Лот № 1: Грузовой специальный самосвал MAZ-555102225, кузов (рама) № Y3M55510250006114.
Начальная цена с НДС 20 % – 17 760,00 руб.
Задаток – 1 776,00 руб.

Лот № 2: Прицеп специальный самосвал MAZ-8571 020, кузов (рама) № Y3M85710050000644.
Начальная цена с НДС 20 % – 9 360,00 руб.
Задаток – 936,00 руб.

Лот № 3: Легковой седан SAMAND LX, кузов (рама) № Y3W2PSMLX9FNX0651 NAAC91CC19F168590.
Начальная цена с НДС 20 % – 4 320,00 руб.
Задаток – 500,00 руб.

Лот № 4: Грузовой специальный самосвал MAZ-555142, кузов (рама) № Y3M55514260001366.
Начальная цена с НДС 20 % – 17 760,00 руб.
Задаток – 1 776,00 руб.

Лот № 5: Грузовой специальный самосвал MAZ-555102 225, кузов (рама) № Y3M55510250005968.
Начальная цена с НДС 20 % – 17 760,00 руб.
Задаток – 1 776,00 руб.

Лот № 6: Прицеп специальный самосвал MAZ 8571 020, кузов (рама) № Y3M85710050000620.
Начальная цена с НДС 20 % – 5 040,00 руб.
Задаток – 504,00 руб.

Лот № 7: Грузовой вагон GAZ-2705, кузов (рама) № 27050090423759 X9627050090647654.
Начальная цена с НДС 20 % – 12 480,00 руб.
Задаток – 1 248,00 руб.

Лот № 8: Трактор МТЗ-1221, кузов (рама) № 12022141.
Начальная цена с НДС 20 % – 37 920,00 руб.
Задаток – 3 792,00 руб.

Лот № 9: Трактор МТЗ-82.1, кузов (рама) № 808102575.
Начальная цена с НДС 20 % – 33 000,00 руб.
Задаток – 3 300,00 руб.

Лот № 10: Разбрасыватель органических удобрений № 264.
Начальная цена с НДС 20 % – 19 320,00 руб.
Задаток – 2 000,00 руб.

Место нахождения Лотов № 1–10:
Минская обл., Минский р-н, поселок Юбилейный, ул. Коммунальная, д. 4а.
Шаг электронных торгов – 5 %.
Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).
Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **22.10.2024 в 16.00.**

Организатор электронных торгов:
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52,
torgi@ino.by
Электронный адрес ЭТП: gostorg.by

УНП 190055182

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга»
ИЗВЕЩАЕТ ОБ ОТМЕНЕ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
№ 2024.Б.002.00089 по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by, принадлежащего ОАО «Минский завод строительных материалов», назначенных на 27.09.2024 в 09.00
(по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY), опубликованных 22.08.2024 в газете «Звязда», на сайте bankrot.gov.by 22.08.2024.
Конт. тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63.

УНП 390477566

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона)
по поручению **открытого акционерного общества «Налибоки Агро»** (продавец)
проводит открытый аукцион

ПО ПРОДАЖЕ ЖИЛОГО ДОМА

с инв. № 622/С-45839 общей площадью 32,9 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 625483402101000181 (право аренды по 16.08.2066) площадью 0,2500 га по адресу: Минская область, Столбцовский район, Налибокский с/с, д. Клетище, ул. Зелёная, 20.

Начальная цена без НДС – **15 800,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **1 580,00** бел. руб.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов: www.rlt.by.

Аукцион состоится **23.10.2024 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **22.10.2024** до **17.00 в каб. 320** по указанному адресу.

Тел: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.
Тел. для осмотра: 8 (01717) 4-84-18, 8 (044) 147-48-23.

УНН 691094106

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона)
по поручению **открытого акционерного общества «Копыльский райагросервис»** (продавец)
проводит открытый аукцион

ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ КОНТОРЫ

с инв. № 642/С-12116 общей площадью 255,5 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 622885000001000027 площадью 0,1534 га
(право постоянного пользования)
по адресу: Минская область, Копыльский район, Тимковичский с/с, 7.

Начальная цена с НДС (20 %) – **15 240,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **1 524,00** бел. руб.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает продавцу затраты на публикацию извещения о проведении аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **23.10.2024** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **22.10.2024** до **16.00** в каб. 320 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11.
Тел. для осмотра: (801719) 2-85-01, 8 (044) 734 38 40.

УНП 600018956

Извещение об открытом аукционе по продаже незавершенного строительством жилого дома и земельного участка в частную собственность в г. Гродно 22 октября 2024 года

№ лота	Местонахождение земельного участка, его кадастровый номер	Площадь земельного участка, га	Характеристика (описание) не завершенного строительством капитального строения	Начальная цена предмета аукциона (в том числе: начальная цена не завершенного строительством капитального строения; земельного участка), руб.	Ориентировочные расходы по подготовке документации для проведения аукциона, руб.	Сумма задатка, руб.
1	Гродненская область, г. Гродно, ул. Ровная, 12 микрорайон «Барановичи-9», У-139 440100000003005934	0,1003	Не завершенное незаконсервированное капитальное строение. Фундамент: железобетон; площадь застройки: 156 кв. м, готовность 11 %	29 138,44 (9 690,27; 19 448,17)	353,64	5 800

Целевое назначение: земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Возможность подключения к внеплощадочным сетям водоснабжения, газоснабжения, электроснабжения и пр., и точки подключения определяются проектом. Земельный участок может иметь ограничения и обременения. Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме).

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: внесение платы за предмет аукциона; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок с момента подписания протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; продолжить строительство жилого дома в установленный срок. Победитель аукциона обязан возместить затраты в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 г. № 298 и решением Гродненского горисполкома от 12.04.2022 г. № 260.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», телефоны: +375 (152) 626055, 626056.

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в указанном размере, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 Гродненское областное управление №400 ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, код назначения платежа 40901, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению; представить в коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы; заявление на участие в аукционе установленной формы; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования; дополнительно представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом негосударственного юридического лица РБ – доверенность, выданная юрлицом, документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Аукцион состоится 22 октября 2024 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117 с 23 сентября по 16 октября 2024 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи, не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220. Аукцион проводится аукционистом при наличии двух или более участников аукциона. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер не поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды последнюю цену и объявляет о продаже предмета аукциона, а участника аукциона – победителем аукциона в отношении соответствующего предмета аукциона. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов. Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан: внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения (информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись); выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона. После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся. Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Міжнародныя сувязі

НА ПАЛЯХ ГОМЕЛЬСКАГА ЭКАНАМІЧНАГА ФОРУМУ

Сумесныя праекты рэгіёнаў і краін, узаемадзеянне ў гандлёва-эканамічнай, навукова-тэхнічнай, гуманітарнай і культурнай сферах чарговы раз сталі прадметам абмеркавання ўдзельнікаў XVIII Гомельскага эканамічнага форуму.

Часткай трохдзённай праграмы міжнароднай падзеі ў жыцці паўднёва-ўсходняга рэгіёна Беларусі стаў таксама III Рэгіянальны бізнес-форум «Гомель—Бранск», які аб'яднаў больш за 100 удзельнікаў. Упершыню ён прайшоў у Гомелі ў 2022 годзе. Летась дэлегацыю Гомельшчыны сустракалі ў Бранску. Цяпер III Рэгіянальны бізнес-форум «Гомель — Бранск» зноў сабраў прадстаўнікоў Гомельшчыны і Браншчыны ў горадзе над Сожам. За два гады правядзення форуму відавочны яго плённыя вынікі.

Як адзначыў на адкрыцці мерапрыемства **старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО**, Бранская вобласць — найбуйнейшы партнёр паўднёва-ўсходняга беларускага рэгіёна. Звыш 180 прадпрыемстваў Гомельшчыны экспартуюць прадукцыю ў суседні расійскі рэгіён, 200 імпартуюць тавары бранскіх вытворцаў.

— У агульным тавараабароце гэта амаль 1000 пазіцый на суму 207 мільёнаў долараў. Гэта больш як пятая частка таго задання, якое паставіў кіраўнік дзяржавы — узняць тавараабарот паміж Беларуссю і Бранскай вобласцю да 1 мільярда долараў у эквіваленце. І я ўпэўнены, што Гомельская вобласць зробіць сур'ёзны ўклад у выкананне гэтай задачы. Наш форум будзе садзейнічаць, — зазначыў Іван Крупко.

Ён падкрэсліў, што супрацоўніцтва Гомельшчыны і Браншчыны закранула ўсе сферы дзейнасці: прамысловую кааперацыю, жыллёвае і дарожнае будаўніцтва, адукацыю, культуру, спорт і турызм. У структуры экспарту Гомельшчыны сярод расійскіх суб'ектаў Бранскі рэгіён займае другое месца. Пры тым што на момант аб'яўлення І Рэгіянальнага бізнес-форуму «Гомель — Бранск» у 2022 годзе гэты паказчык быў на сёмай пазіцыі.

— Форум — магчымасць актывізаваць дзеючыя дзелавыя кантакты і знайсці новыя напрамкі ўзаемадзеяння, — канстатаваў Іван Крупко.

Намеснік губернатара Бранскай вобласці Галіна ПЕТУШКОВА звярнула ўвагу на значны рост зацікаўленасці ва ўдзеле ў бізнес-форуме «Гомель — Бранск» прадстаўнікоў дзелавых колаў Браншчыны.

— Удзельная вага Гомельскай вобласці ў агульным тавараабароце Бранскай вобласці з Беларуссю ў 2023 годзе склала больш за 33 %. Станоўчая дынаміка захоўваецца і сёння. Па выніках першага паўгоддзя бягучага года тавараабарот Гомельскай вобласці з Бранскай вобласцю вырас больш як на 20 %. Нам ёсць, вядома, над чым яшчэ працаваць, але вынікі, якія сёння маем, ужо значныя, — заўважыла Галіна Петушкова.

Кансалідацыйную ролю міжрэгіянальных адносін Браншчыны і Гомельскай вобласці абазначыў **старшыня Бранскай абласной Думы Валянцін СУБАТ**.

— У цяперашніх умовах развіцця эканомікі вельмі добра мець такога суседа, на якога можна разлічваць, вучыцца адзін у аднаго, падтрымліваць ва ўсім. І толькі так сёння можна выжыць, таму што калектыўны Захад настроены супраць нас, супраць Расіі і Беларусі, а мы разам — сіла, — падкрэсліў Валянцін Субат.

Падчас пасяджэння III Рэгіянальнага бізнес-форуму «Гомель — Бранск» былі падпісаны дакументы аб супрацоўніцтве. Так, заключана Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Гомельскім гарадскім выканаўчым камітэтам і Бранскай гарадской адміністрацыяй, Пагадненне аб пабрацімскіх сувязях паміж Жлобінскім райвыканкамам і Клінцоўскай гарадской адміністрацыяй Бранскай вобласці. Генеральны дырэктар ААТ «Гомельскі домабудаўнічы камбінат» Аляксандр Ганчароў і дырэктар дэпартамента будаўніцтва Бранскай вобласці Яўген Захаранка падпісалі таксама інвестыцыйны дагавор аб будаўніцтве 2-секцыйнага 9-павярховага жылога дома ў Бранску.

Праграма знакавай міжнароднай падзеі ў жыцці Гомельшчыны — XVIII Гомельскага эканамічнага форуму — пачалася з урачыстага прыёму кіраўнікоў дэлегацый. У Палацы Румянцавых і Паскевічаў старшыня аблвыканкама Іван Крупко сустрэўся з прадстаўнікамі дэлегацый з 16 краін. Так, удзельнікамі форуму сталі госці з Казахстана, Кітая, В'етнама, Манголіі, Індыі, Ірана, Палесціны, Аб'ядналых Арабскіх Эміратаў, Зімбабвэ, Бразіліі, Пакістана і іншых краін. На форум прыехалі таксама дэлегацыі з расійскіх рэгіёнаў — Бранскай, Магаданскай, Кіраўскай і іншых абласцей, Прыморскага краю, Башкартастана.

У рамках форуму падпісаны шэраг дакументаў аб супрацоўніцтве ў галіне лічбавага развіцця, адытыўных тэхналогій, кібербяспекі паміж Гомельскім аблвыканкамам і дзяржкарпарацыяй «Расатам» (ТАА «РусатамБел»). Падпісаны пратакол аб намерах па рэалізацыі інвестпраекта на базе ААТ «Мілкавіта» па выпуску агламераванага малака. Падпісаны пагадненне аб устанаўленні пабрацімскіх сувязяў паміж Гомелем і Магаданам, Мемарандум аб узаемным супрацоўніцтве Адміністрацыі СЭЗ «Гомель-Ратон» і генеральнай дырэкцыі СЭЗ «Бішкек» у Кіргізіі.

Удзельнікі форуму змаглі ацаніць экспазіцыі харчовай, швейнай, медыцынскай, хімічнай прамысловасці, а таксама домабудаўнічай, дарожнай, лесагаспадарчай і іншых вытворчасцяў. Узоры прадукцыі ў брэндзіраваных павільёнах прадставілі звыш 50 вытворцаў Гомельскай вобласці.

Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.

ЗАМЕНЕНА АБСТАЛЯВАННЕ І ПАДРЫХТАВАНА ПАЛІВА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На сёння ўсе прадпрыемствы, якія ўваходзяць у састаў гэтага дзяржаўнага аб'яднання, атрымалі 100 працэнтаў пашпартоў гатоўнасці спажыўцоў і цеплавых крыніц.

У прыватнасці, прыведзены ў здавальняльны тэхнічны стан кацельні, аптымізаваны рэжымы іх эксплуатацыі. Персанал прайшоў спецыяльныя інструктажы і супрацьаварыйныя трэніроўкі. Выканана комплекснае абследаванне больш за 7 тысяч кіламетраў падземных газаправодаў, ацэнены тэхнічны стан звыш 650 кіламетраў падземных газаправодаў з тэрмінам службы больш за 40 гадоў. Заменена звыш 93 тысяч састарэлага бытавога абсталявання.

Аляксандр Белкін таксама заявіў, што прадпрыемствы тарфяной галіны аб'яднання гатовыя забяспечыць унутраны рынак краіны тарфяным палівам у поўным аб'ёме. На сёння здабыта звыш 1,7 мільёна тон торфу, выраблена больш за 500 тысяч тон брыкетаў і тарфяной сушонкі. Ведамасныя арганізацыі рэалізавалі звыш 120 тысяч тон паліўных брыкетаў.

«Свет тэхналогій ступіў далёка наперад. Аднак, каб у зімовы час забяспечыць сабе паўнавартаснае жыццё, людзям неабходна патурбавацца аб нарыхтоўцы тарфяных брыкетаў і загадзя звярнуцца ў паліваазабяспечвальную арганізацыю з заяўкай на дастаўку паліва», — дадаў начальнік упраўлення.

ШТО ТРЭБА ВЕДАЦЬ І РАБІЦЬ ЖЫХАРАМ

Да таго ж Аляксандр Белкін нагадаў, што неабходна своечасова ажыццяўляць замену газавыкарыстоўвальнага абсталявання, такога як газавыя пліты, вадагрэйныя катлы і праточныя воданагравальнікі. Для гэтага дастаткова звярнуцца ў Цэнтр абслугоўвання насельніцтва газазабеспячальным арганізацыям і атрымаць увесь комплекс паслуг па замене бытавога газавага абсталявання. Такія цэнтры арганізаваны ў кожным раённым цэнтры. Таксама неабходна правяраць тэхнічны стан і надзейнасць дымавых і вентыляцыйных каналаў. Абавязак сачыць за іх станам у прыватным сектары ўскладзена на спажыўцоў, а ў шматкватэрным жылым фондзе — на арганізацыі, якія эксплуатуюць жыллёвага фонду і якія аказваюць жыллёва-камунальныя паслугі.

Сярод прафілактычных мер ён адзначыў установку сігналізатараў кантролю канцэнтрацыі метану і чаднага газу. Такія сродкі вымярэння ўсталёўваюцца ў памяшканнях з ацяпляльным і вадагрэйным газавым абсталяваннем. Яны дазваляюць своечасова папярэдзваць грамадзян аб небяспечнай канцэнтрацыі гаручых газаў і спрыяюць прыняццю неадкладных мер па недапушчэнні аварыйных сітуацый, выбухаў, пажараў пры выкарыстанні газу ў побыце. «Ва ўсіх населеных пунктах нашай краіны дзейнічае скарочаны нумар 104, куды неабходна тэлефанаваць у выпадку, калі вы адчулі пах газу», — нагадаў спецыяліст.

ЯК СПРАВЫ Ў СПАЖЫЎЦОЎ ЦЕПЛАВОЙ ЭНЕРГІІ?

Як аказалася, цалкам прымальна. Пашпарты гатоўнасці да ацяпляльнага сезона ў нашай краіне атрымалі 90 % спажыўцоў і 91 % цеплавых крыніц. Як адзначыў **намеснік генеральнага дырэктара — галоўны інжынер Дзяржэнергагазнагляду Аляксандр ГУЛЕВІЧ**, вынікам падрыхтоўкі да работы ў асенне-зімовы перыяд з'яўляецца рэгістрацыя пашпартоў гатоўнасці спажыўцоў цеплавой энергіі і цеплакрыніц у Дзяржэнергагазнаглядзе.

У цэлым па краіне падлягаюць афармленню пашпарта гатоўнасці 29 209 спажыўцоў цеплавой энергіі і 10 410 ведамасных цеплакрыніц. Рэгістрацыя ажыццяўляецца ў адпаведнасці з графікамі, зацверджанымі мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі. На стане на сёння ўжо можна падвесці папярэднія вынікі гэтай работы ў разрэзе абласцей.

Брэсцкая вобласць зарэгістравала 94 % пашпартоў гатоўнасці спажыўцоў цеплавой энергіі і 96 % пашпартоў гатоўнасці цеплакрыніц, Віцебская — 78 % і 83 %, Гомельская — 100 % па абодвух пунктах, Гродзенская — 98 %, Магілёўская — 99 %, Мінская — 79 % і 82 %, Мінск — 79 % і 75 %. Усяго па краіне зарэгістравана на сёння 90 % пашпартоў гатоўнасці спажыўцоў цеплавой энергіі і 91 % пашпартоў гатоўнасці цеплакрыніц.

Дарэчы, першай вобласцю, якая зарэгістравала 100 % пашпартоў гатоўнасці, стала Гомельская. Іх рэгістрацыя была завершана 2 верасня.

Што датычыцца падрыхтоўкі да зімы паліўна-энергетычнага комплексу краіны, на сёння ў поўным аб'ёме зарэгістраваны пашпарты гатоўнасці арганізацый, якія ўваходзяць у сістэму Міністэрства энергетыкі. Што датычыцца арганізацый канцэрна «Белнафтахім», то спажыўцы атрымалі 95 % пашпартоў гатоўнасці, а цеплакрыніцы — 97 %.

У частцы газавага нагляду сур'ёзная ўвага — газіфікаваным шматкватэрным жылым дамам. Такіх у Беларусі больш за 43 тысячы. На сёння больш за 95 % іх абследавана, пацверджана іх гатоўнасць да асенне-зімовага перыяду. Таксама сур'ёзная ўвага Дзяржэнергагазнаглядам удзяляецца кантролю за аднаўленнем пашкоджаных кабельных ліній. Па стане на 10 верасня ў краіне было пашкоджана 115 кабельных ліній, у тым ліку восем кабельных ліній, якія ажыццяўляюць электразабеспячэнне спажыўцоў першай катэгорыі.

Аляксандр Гулевіч таксама назваў тыпавыя парушэнні пры падрыхтоўцы арганізацыі да работы ў асенне-зімовы перыяд. Гэта адсутнасць цеплавой ізаляцыі цеплаўстановак цеплавых сетак, несвоечасовае прадстаўленне актаў іх гідраўлічных выпрабаванняў, прамыванняў, несвоечасовае прадстаўленне актаў праверкі дымавых і вентыляцыйных каналаў, нездавальняльны стан дымавых каналаў, парушэнне цэласнасці ізаляцыі кабеляў і электраправодак.

«Сёлета ёсць новаўвядзенне. На Адзіным партале электронных паслуг даступна да заказу адміністрацыйная працэдура 3.10.1. Гэта рэгістрацыя пашпарта гатоўнасці цеплакрыніцы або пашпарта гатоўнасці спажыўца цеплавой энергіі да работы ў асенне-зімовы перыяд. Пры наяўнасці аформленага акта гатоўнасці рэгістрацыя пашпартоў ажыццяўляецца аўтаматычна, калі няма неабходнасці наведваць структурнае падраздзяленне Дзяржэнергагазнагляду. Такім спосабам ужо зарэгістраваны 643 пашпарты гатоўнасці спажыўцоў цеплавой энергіі і 530 пашпартоў гатоўнасці цеплакрыніц», — адзначыў галоўны інжынер Дзяржэнергагазнагляду.

Падрыхтоўка да работы ў асенне-зімовы перыяд павінна быць скончана, а пашпарты гатоўнасці неабходна зарэгістраваць да 30 верасня. «Работнікі нашай арганізацыі працуюць і ў выхадныя дні, асабліва ў гэты час, каб забяспечыць тэмпы рэгістрацыі пашпартоў гатоўнасці», — падкрэсліў Аляксандр Гулевіч.

Сяргей КУРКАЧ.

«АРХІЎ СТАРАЖЫТНЫХ ГРАМАТ» І НАРОДНЫЯ ПЕСНІ 1874 ГОДА...

Адкрылася выстава рэдкіх кніг, падораных Прэзідэнту Беларусі

Незвычайнае падарожжа ў гісторыю, культуру і навуку розных краін прапануе адзейсніць Нацыянальная бібліятэка Беларусі з дапамогай кніжнай выставы «Кнігі ў дар Прэзідэнту», якая адкрылася 20 верасня ў атрыуме другога паверха «дыямента ведаў».

У экспазіцыі — кнігі, падораныя Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь кіраўнікамі дзяржаў блізкага і далёкага замежжа, дзяржаўнымі і культурнымі дзеячамі. Гэта больш за паўсотні выданняў са збораў Палаца Незалежнасці, Прэзідэнцкай бібліятэкі і Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь. Кнігі на розных мовах, з розных краін — Азербайджана, Зімбабвэ, Ізраіля, Казахстана, Кыргызстана, Кітая, Манголіі, ААЭ, Расіі, Сербіі, Таджыкістана, Туркменістана, Турцыі, Узбекістана. Дарчыя надпісы робяць рарытэты яшчэ больш каштоўнымі. І гэта не толькі сучасныя выданні, але і рэдкія кнігі XVIII—XIX стст. Напрыклад, выданне 1702 года «Жыціе святых» адметнае тым, што на тытульнай старонцы змешчана першая датаваная выява Магілёва. Яшчэ адзін рарытэт — выданне беларускіх народных песень 1874 года, сабраных вядомым беларускім этнографам XIX ст. Паўлам Шэйнам, з аўтографам самога Шэйна. Вялікую каштоўнасць для беларускай культуры мае «Белорусский архив древних грамот» археографа XIX ст. Івана Грыгаровіча, дзе ўтрымліваецца больш за 50 дакументаў XVI—XVIII стст.

Многія выданні распавядаюць пра гісторыю і сучаснасць тых ці іншых краін, напрыклад, Прэзідэнт Рэспублікі Казахстан Нурсултан Назарбаеў падарыў Прэзідэнту Беларусі адметнае выданне твораў класіка казахскай літаратуры Абая. Ёсць выданні, што прадстаўляюць сучасную Беларусь, як фотаальбом «Беларускі касмічны апарат. Ад ідэі да запуску». Генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Вадзім Гігін недарэмна заўважыў, што менавіта праз кнігу можна ўбачыць усю эпоху суверэннай незалежнай Беларусі. Дзякуючы выставе, можна пазнаёміцца і з дыпламатычнай дзейнасцю Прэзідэнта Беларусі, тым болей экспазіцыя суправаджаецца фотаздымкамі замежных паездак Аляксандра Лукашэнкі з архіва БЕЛТА.

Выстава «Кнігі ў дар Прэзідэнту» адкрылася з удзелам першага намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Наталлі Пяткевіч і старшыні Цэнтральнай выбарчай камісіі Ігара Карпенкі, прыйшлі і дыпламаты розных краін. Вадзім Гігін звярнуў увагу прысутных на тое, што адкрыццё выставы прымеркавана да важнай даты, якую мы адзначаем сёлета, — 30-годдзя інстытута Прэзідэнцтва ў нашай краіне.

Плануецца, што экспазіцыя будзе працаваць да 12 студзеня 2025 года. Прайсці туды можна па чытацкім білеце бібліятэкі альбо пропуску сацыякультурнага цэнтра.

Людміла ІВАНОВА.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Добрая справа

КУРС ДАПАМОГІ — НА КУРСК

У Беларусь вярнуўся кіроўца, які адвёз суседзям гуманітарны груз

Не так даўно Беларускі саюз жанчын адправіў больш за 20 тон дапамогі ў Курскую вобласць Расіі. Збіралі неабходнае ва ўсіх рэгіёнах краіны на працягу некалькіх тыдняў: бакалея, дзіцячае харчаванне, прадметы гігіены, коўдры, падушкі. Апошнія каробкі дадалі ў машыну ўжо ў Мінску. Кантакты для сувязі шукаць доўга не прыйшлося: некалькі месяцаў таму БСЖ і Курская вобласць падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве. Узаемадзеянне якраз і пачалі з дабрачыннасці — збору гуманітарнай дапамогі.

Фота Белмытсэрвіс.

«НЕ МОЖАМ ЗАСТАЦЦА ЎБАКУ»

Перад адпраўкай грузу **старшыня канцэрна «Беллегпрам», старшыня аб'яднанай арганізацыі БСЖ канцэрна Таццяна ЛУГІНА** адзначыла, што для Беларускага саюза жанчын стала добрай традыцыяй аказваць дапамогу людзям, якія трапілі ў складаныя ўмовы. «Не магу сказаць, што нехта адзін быў ініцыятарам. У нас так ужо склалася: калі мы бачым землятрус, навадненне, прыродныя катаклізмы — аказваем дапамогу. А тут трагедыя, якую нельга ўявіць любому чалавеку. Калі мы бачым разбурэнні, дзіцячыя пакуты, то разумеем, што людзі засталіся без прытулку, і не можам застацца ўбаку», — сказала яна.

Таццяна Лугіна падкрэсліла, што да збору грузу далучылася кожная структура Беларускага саюза жанчын: «Хтосьці аказваў матэрыяльную дапамогу, пералічваў грашовыя сродкі на рахунак. Хтосьці прыносіў рэчы для дзяцей і дарослых, тавары штодзённага ўжытку. Кіраўнік дзяржавы навучыў, што, калі прыходзіць бяда ў дом да нас або да суседзяў, кожны сам павінен ініцыятыву і дапаможа. Няхай часцінка беларускага цяпла дапаможа камусьці сагрэцца».

СУСТРАКАЛІ ЎРАЧЫСТА

Кіроўца грузавога аўтамабіля Белмытсэрвіс Аляксандр КАХОВІЧ працуе ў сферы грузаперавозак ужо чацвёрты год. За гэты час бачыў нямала розных месцаў, праехаў дзясяткі тысяч кіламетраў. Але адзін з апошніх рэйсаў стаў для яго асаблівым: «Гэта быў мой першы выезд з гуманітарным грузам. Маршрут важны, але не самы вялікі. Ад Беларусі да Курска прыкладна 1300 кіламетраў у адзін бок. А так, бывае, езджу і на больш доўгія дыстанцыі. У той жа Чалябінск, за Урал часта. Грузы дастаўляюцца па ўсёй тэрыторыі Расіі».

Аднак адной змены, каб даехаць да Курска, не хапіла. Усе грузаперавозчыкі выконваюць рэжым адпачынку і працы. Плюс да гэтага дадаюцца пагрузачна-разгрузачныя работы, праверка і афармленне ўсіх неабходных дакументаў. «Такім чынам, выехаў 9-га, а прыехаў 11-га чысла. Раніцай мяне сустрэлі каля Курска, суправадзілі праз горад да месца выгрузкі. Там сабралася вялікая колькасць чалавек са святарамі і валанцёрамі. Сустракалі ўрачыста. Людзі дружна, хвілін за 15 выгрузілі ўсё, што было ў машыне. Пасля мяне запрасілі на гарбату, а таксама зрабілі памятнае фота», — распавёў Аляксандр.

Адразу пасля яго ад'езду на месца выгрузкі прыехала іншая машына з грузам. Дапамога расіянам аказваецца пастаянна. «У самім горадзе ўсё працуе. Людзі ходзяць на работу, ездзяць аўтобусы і тралейбусы — усё ў рабочым рэжыме, гараджане жывуць сваім жыццём. Аднак на ўездзе ў горад стаяць спецыяльныя пасты з паліцыяй і ваеннаслужачымі. Таксама не працуе навігатар, таму мяне і суправаджалі. Сотавая сувязь і інтэрнэт ёсць, а вось у плане навігацыі ні адзін GPS не працуе. Яшчэ заўважыў, што з вечара ў горадзе няма святла, усюды цёмна...» — расказаў беларускі кіроўца.

«ПРОСТА ВЫКОНВАЮ СВАЮ РАБОТУ»

Аляксандр чуў сірэну ноччу і раніцай. «Ад гэтага робіцца не па сабе. Па горадзе размешчана шмат сховішчаў з адпаведным надпісам, — адзначыў Аляксандр Каховіч. — Калі паступіць прапанова зноў весці гуманітарны груз, вядома, паеду. Я проста выконваю сваю работу. Але вельмі прыемна, што гэтым разам мне ўдалося давезці наша беларускае цяпло да Курска. Людзі там вельмі добра ставяцца да беларусаў. І наша цяпло сустрэлі таксама з цеплынёй».

Герой матэрыялу распавёў, што дарога дадому заўсёды здаецца хутчэйшай і карацейшай: «Мне падабаецца мая работа: гэта бясконцая дарога, падарожжа, машыны, людзі. Я нават не ведаю, як гэта растлумачыць. Мне заўсёды цікава пагутарыць з новымі людзьмі, паглядзець на новыя гарады. А дарога дадому, на Радзіму, праўда здаецца хутчэйшай і карацейшай. Магчыма, тут уплывае глядзельная памяць. Як ні круці, але ты запамінаеш пройдзены маршрут. Атрымалася нават прыехаць раней, чым планавалася. Не люблю, каб мяне чакалі. Лепш сам пачакаю, раней прачнуся ды паеду».

Аляксандр звярнуў увагу: «Якая б дарога ні была, па дому заўсёды паспяваеш засумаваць. Дзякуй Богу, што сёння мы жывём у мірнай краіне, дзе не гінуць людзі і не патрэбны хованкі».

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.

Еўропа выйшла з берагоў

Чаму наймацнейшая паводка аказалася такой спусташальнай?

Магутны шторм «Борыс», які напрыканцы мінулага тыдня абрынуўся на шэраг краін Цэнтральнай Еўропы, днямі дасягнуў Італіі — на большай частцы тэрыторыі гэтай краіны аб'яўлены папярэджанні аб ліўнях, моцным ветры і паводках. Ратавальнікі эвакуіравалі з італьянскай вобласці Эмілія-Раманья амаль тысячу чалавек, паведаміла PIA «Новости» са спасылкай на выданне Repubblica. Выратавальныя аперацыі ў большай ступені закранулі жыхароў правінцыі Равена, дзе свае дамы пакінулі звыш 800 чалавек. Астатняя частка эвакуіраваных пражывала ў раёне Балоні. Мэры гарадоў Чэзена, Форлі, Рыміні і дзясятка дробных населеных пунктаў распарадзіліся аб закрыцці школ. Шэраг правінцый рэгіёна аб'явілі максімальны чырвоны ўзровень кліматычнай небяспекі. Як вядома, Эмілія-Раманья, якая знаходзіцца ў цэнтральнай і паўночнай частцы Апенін, пацярпела ад разбуральнай паводкі летась у маі. Тады ахвярамі стыхійнага бедства тут сталі 17 чалавек, а ўрон склаў каля 10 мільярдаў еўра. Чаму ж сёлетняя вераснёўская паводка аказалася такой спусташальнай для еўрапейскіх краін?

ХАОС І РАЗБУРЭННІ

З-за вялікай колькасці дажджоў, якія выпалі ў Альпах, узровень вады ў некалькіх рэках, у тым ліку ў Дунаі, узняўся. Паводка выклікала хаос і забрала жыцці больш чым 20 чалавек па ўсёй Цэнтральнай Еўропе. Пра гэта паведаміла Reuters. Паводка пакінула пасля сябе разбуральны след ад Румыніі да Польшчы. Раёны чэшска-польскай граніцы — сярод найбольш пацярпелых: рэкі, якія выйшлі з берагоў, разбурылі гістарычныя гарады, абрынуўшы масты і знішчыўшы дамы.

У Румыніі з-за наступстваў непагадзі загінулі па меншай меры каля сямі чалавек. Акрамя таго, вядома, што ў Польшчы загінулі шэсць чалавек, у Аўстрыі — пяць. Тры ахвяры паводкі ў Чэхіі. Дзясяткі тысяч чэшскіх і польскіх хатніх гаспадарак па-ранейшаму застаюцца без электрычнасці і прэснай вады.

У Чэхіі з-за паводкі аказаліся без электрычнасці звыш 60 тысяч хатніх гаспадарак. Пра гэта паведаміў партал denik.cz. Паводле яго інфармацыі, найбольш пацярпелі Мараўскасілезскі і Оламаўцкі краі. У гарадах Багумін і Крноў, дзе былі затоплены буйныя падстанцыі, сутыкаюцца з праблемамі аднаўлення электразабеспячэння. У Крнове людзі некалькі дзён заставаліся без электрычнасці.

Як паведаміла «Бі-бі-сі», ратавальныя службы ў Польшчы, Чэхіі, Аўстрыі і Румыніі з цяжкасцю спраўляліся з уздымам узроўню вады ў рэках з-за моцных ліўняў. Паводкі прывялі да таго, што сотні тысяч людзей засталіся без электрычнасці, з раёнаў, якія моцна пацярпелі, іх эвакуіруюць у бяспечныя месцы.

Моцна пацярпеў Кракаў, многія жыхары якога былі эвакуіраваны, спыніўся нават грамадскі транспарт. З-за моцных дажджоў абвалілася плаціна ў Мендзыгужы, на паўднёвым захадзе Польшчы. Горад Устронь у Цешынскім павеце (Сілезскае ваяводства) апынуўся часткова пад вадой пасля таго, як рака Млынаўка выйшла з берагоў у выніку моцнай начной залевы.

Як паведаміла агенцтва PAP, урад Польшчы 16 верасня ўвёў палажэнне аб стане стыхійнага бедства ў некаторых рэгіёнах краіны, якія пацярпелі ад паводкі, тэрмінам на 30 дзён. У пастанове ўказана, што ва ўмовах стыхійнага бедства могуць прымяняцца абмежаванні свабод і правоў чалавека і грамадзяніна: патрабаванне вызваліць або забяспечыць ахову жылых памяшканняў або іншых памяшканняў; загад аб эвакуацыі ва ўстаноўлены час з канкрэтных месцаў, тэрыторый і аб'ектаў; забарона знаходжання ў пэўных месцах і аб'ектах і на пэўных тэрыторыях; таксама загад або забарона пэўнага спосабу перамяшчэння. 17 верасня прэм'ер-міністр Польшчы пашырыў тэрытарыяльную сферу дзеяння палажэння аб стане стыхійнага бедства. Дарэчы, у пачатку мінулага тыдня Туск заспакойваў, што... «прагнозы не занадта трывожныя».

ЗНІКЛІ БЕЗ ВЕСТАК

Чэшскі горад Крноў, які размешчаны прыкладна за 240 кіламетраў на ўсход ад Прагі, дзе амаль 23 тысячы жыхароў, быў практычна цалкам затоплены рэкамі Опава і Апавіцы, якія зліліся. Намеснік мэра Міраслаў Бінар заявіў, што да 80 працэнтаў тэрыторыі горада апынулася пад вадой. Муніцыпалітэт аказаўся не здольны арганізаваць дапамогу гараджанам. Сітуацыя горшая, чым падчас паводкі 1997 года. Становішча засталося крытычным і ў многіх іншых месцах на ўсходзе краіны, асабліва ў Апаве і Астраве.

Служба выратавання паведаміла, што ў раёне Галац на паўднёвым усходзе Румыніі было пашкоджана каля 5 тысяч дамоў, ёсць зніклыя без вестак. Сотні людзей прыйшлося ратаваць ад паводак па ўсёй краіне. Як заявіў прэзідэнт Румыніі Клаус Ёханіс, «мы зноў сутыкнуліся з наступствамі змены клімату, якія становяцца ўсё больш заўважнымі на еўрапейскім кантыненце і маюць драматычныя наступствы».

У Чэхіі паўночна-заходні адміністрацыйны рэгіён Усці-над-Лабем, які мяжуе з Германіяй, пацярпеў больш за ўсё: не менш як 20 тысяч хатніх гаспадарак засталіся без электрычнасці. Самы высокі ўзровень папярэджання аб паводцы быў аб'яўлены прыкладна ў 35 населеных пунктах. З-за разбуральнага ўрагану больш як 250 тысяч хатніх гаспадарак у краіне засталіся без электрычнасці.

З-за разліваў рэк — Эльбы, Дуная, Нісы і Одры — пацярпелі і рэгіёны Германіі. Мясцовыя ўлады чакаюць другой хвалі паводак. Усё залежыць ад надвор'я. У Славакіі міністр аховы навакольнага асяроддзя Томаш Тараба заявіў, што Дунай ноччу падняўся амаль на 10 метраў, і зараз узровень вады будзе марудна зніжацца. Ён адзначыў, што ўрон, нанесены паводкамі па ўсёй краіне, ацэньваецца ў 20 мільёнаў еўра.

У Аўстрыі асабліва моцна пацярпела ад паводкі федэральная зямля Ніжняя Аўстрыя вакол Вены. Небяспечная сітуацыя склалася на рацэ Кемп, якая ўпадае ў Дунай. Вадаёмы ў вярхоўях ракі аказаліся поўныя да краёў, і кантраляваны скід вады прывёў да далейшага набракання ракі ў ніжнім цячэнні. Дарога паміж Венай і Зальцбургам перакрытая з-за магчымых апоўзняў і камянепадаў. Апроч паводкі, сітуацыю пагоршыў ураган. З-за суровага надвор'я Ніжняя Аўстрыя аб'яўлена зонай бедства.

ДУНАЙ УЗНЯЎСЯ АМАЛЬ НА 8,5 МЕТРА

У Венгрыі, у гарадах Вішаград і Сентэндрэ, на поўнач ад Будапешта, улады ўстанавілі мабільныя плаціны, рыхтуючыся да разліву Дуная. У венгерскай сталіцы закрылі востраў Маргіт — зону адпачынку з атэлямі і рэстаранамі. Цяпер у гэтай краіне настаў крытычны этап паводкі. Найвышэйшы ўзровень паводкавай хвалі быў дасягнуты ў сераду, пік узроўню вады ў Дунаі быў адзначаны ў чацвер. Але «вялікая вада» яшчэ наперадзе. У Будапешце максімальная вышыня ракі мяркуецца ў суботу, а да чацвярга наступнага тыдня пік паводкі ўжо павінен пакінуць венгерскую тэрыторыю. Аб гэтым паведаміла PIA «Новости» са спасылкай на заяву прэм'ер-міністра Венгрыі Віктара Орбана на прэс-канферэнцыі, якую трансліраваў тэлеканал M1.

«У Будапешце мы чакаем піку ў суботу днём ці ўвечары. Вада будзе вышынёй за 846 сантыметраў, а найвышэйшы ўзровень вады ў Будапешце быў зарэгістраваны ў 2013 годзе і склаў 891 сантыметр, гэта значыць, ён будзе на 40—50 сантыметраў ніжэйшы», — адзначыў венгерскі прэм'ер.

Паводле прагнозаў Нацыянальнага ўпраўлення водных рэсурсаў, узровень Дуная ў Будапешце звычайна складае каля 3,5 метра. Раней у чэрвені ў выніку паводак гэты паказчык павышаўся да 670 сантыметраў. Такім чынам, крыху затоплены аказаліся ніжнія набярэжныя ў цэнтры горада, вышыня якіх 6,5 метра. Да такога ж узроўню Дунай у Будапешце ўзнімаўся летась напрыканцы снежня.

Мінабароны Венгрыі задзейнічала 1,4 тысячы ваенных і спецыяльную тэхніку ў прылеглых да Дуная раёнах краіны для барацьбы з наступствамі паводкі. Аб гэтым праінфармаваў дзяржсакратар па міжнародных камунікацыях і сувязях у офісе венгерскага прэм'ера Золтан Ковач, паведаміла ТАСС.

«Ваеннаслужачыя кругласутачна працуюць уздоўж Дуная, ад Дзьёр-Машон-Шапрон да акругі Пешт», — напісаў Ковач у сацсетцы. «На дамбы будзе накіравана столькі салдат, колькі спатрэбіцца», — заявіў кіраўнік Мінабароны Венгрыі Крыштаф Салай-Бароўніцкі. Як адзначылі ва ўрадзе краіны, узброеныя сілы гатовы задзейнічаць у барацьбе з наступствамі стыхіі машыны-амфібіі і верталёты.

СТРАТЫ — ТРЫЛЬЁН ЕЎРА

Адметна, што ў 1997 годзе ў тым жа рэгіёне — у Польшчы, Германіі, Славакіі, Чэхіі, Аўстрыі — адбылася «паводка тысячагоддзя». Толькі ў Польшчы тады загінулі 56 чалавек, былі затоплены жылыя раёны Вроцлава. Аб гэтых падзеях у 2022 годзе на Netflix выйшаў польскі серыял «Высокая вада».

Тым не менш высновы не былі зроблены — цяперашняя наймацнейшая паводка заспела Польшчу знянацку. Маштабы катастрофы былі б значна меншымі, калі б польскія ўлады выдзялялі сродкі на прэвентыўныя меры. Аб гэтым піша Mysl Polska. «Ужо больш за два гады мы выдаткоўваем сотні мільёнаў злотых на падтрыманне вайны ва Украіне. У нас кішэні пустыя, а ў кампаній па вытворчасці зброі наадварот. Няма грошай на вадасховішчы, няма грошай на насыпы, але былі сродкі на вайну, як і на ўкраінцаў», — адзначае аўтар матэрыялу.

«Вядома, цалкам ухіліць наступствы гэтай катастрофы, магчыма, і не атрымалася б, але яе маштабы, напэўна, былі б значна меншымі, калі б былі пабудаваны вадасховішчы (якія б абаранялі ад паводак. — **Рэд.**). Паглядзіце на Прагу ў Чэхіі, яе затапіла, і з гэтага зрабілі высновы. Цяпер у Празе не мяшкі з пяском, а шчыльны стальны бар'ер уздоўж ракі Влтавы», — заўважае Mysl Polska. Аўтар выказвае меркаванне, што ўлады насамрэч «вядуць краіну да разбурэння».

Тым часам стала вядома, што рэзервуары коштам у мільёны польскіх злотых у Кракаве разбураюцца з-за дажджоў. Аб гэтым паведаміла Gazeta. «Гэтае вадасховішча ў Кракаве на вуліцы Фальварчна. Пабудаванае менш за два месяцы таму, яно павінна было абараніць Нова-Хуту ад паводак. На яго і яшчэ адно падобнае вадасховішча выдаткавалі 11 мільёнаў злотых (2,57 млн еўра), — напісаў жыхар Кракава Лукаш Гібала ў сацсетках. А што адбылося падчас першага моцнага дажджу? Вада проста пацякла праз рэзервуар, які абрынуўся і пакінуў... лужыну».

Інтэрнэт-карыстальнікі раскрытыкавалі польскі ўрад у сацыяльных сетках за блытаніну ў інфармацыі адносна паводкі. І толькі праз некалькі дзён Міністэрства лічбавізацыі краіны аб'явіла аб запуску новага сайта, на якім можна знайсці ўсю важную і праверануюінфармацыю. Да таго ж заява міністра клімату і навакольнага асяроддзя Паўліны Хеніг-Клоска аб ільготных крэдытах на ліквідацыю наступстваў паводкі выклікала сапраўдны ажыятаж. Праўда, пасля яна растлумачыла, што сродкі будуць прадстаўлены толькі муніцыпалітэтам, а не ахвярам паводкі.

Навукоўцы заклікаюць урады інвеставаць у адаптацыю да экстрэмальных з'яў надвор'я з дапамогай сістэм ранняга папярэджання, больш устойлівай інфраструктуры і схем падтрымкі пацярпелых. Як вядома, еўрапейскі механізм грамадзянскай абароны (CPM) да спусташальных паводак актываваліі рэкордныя 29 разоў у сувязі з экстрэмальнымі сітуацыямі, найперш лясныміі пажарамі. Пра гэта паведаміла газета Financial Times (FT) са спасылкай на даныя, прадстаўленыя ёй Еўракамісіяй. Летась такія надзвычайныя меры, якія прадугледжваюць каардынацыю выкарыстання рэсурсаў для абароны грамадзянскага насельніцтва і аказання неадкладнай дапамогі краінам, у якіх адбыліся прыродныя і тэхнагенныя катастрофы, прыраліся 23 разы.

Еўрапейскае агенцтва па навакольным асяроддзі ў сакавіку заявіла, што без рашучых дзеянняў кліматычныя рызыкі ў Еўропе могуць дасягнуць крытычнага ці катастрафічнага ўзроўню да канца гэтага стагоддзя, нагадвае FT. Згодна з прагнозамі агенцтва, сотні тысяч людзей могуць загінуць ад спякоты, а штогадовыя эканамічныя страты толькі ад паводак ва ўзбярэжных раёнах могуць перавысіць трыльён еўра. Відавочна, што еўрапейскім уладам варта вызначыцца з жыццёва неабходнымі прыярытэтамі. У інтарэсах простых людзей.

Захар БУРАК.

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении электронных торгов
по продаже имущества, принадлежащего
ОАО «Авиакомпания Гродно» (Продавец)

Электронные торги состоятся 29.10.2024.

Лот № 1: Авиадвигатель АШ-62ИР К16272140 (инв. № 0000001204, заводской № К16272140, год выпуска 1982). Начальная цена с НДС 20 % – 47 760,00 руб. Задаток – 4 776,00 руб.

Лот № 2: Авиадвигатель АШ-62ИР К16436108 (инв. № 0000011071, заводской № К16436108, год выпуска 1986). Начальная цена с НДС 20 % – 47 760,00 руб. Задаток – 4 776,00 руб.

Лот № 3: Авиадвигатель АШ-62ИР К16364148 (инв. № 0000001212, заводской № К16364148, год выпуска 1984). Начальная цена с НДС 20 % – 47 760,00 руб. Задаток – 4 776,00 руб.

Лот № 4: Авиадвигатель АШ-62ИР К16395148 (инв. № 0000001227, заводской № К16395148, год выпуска 1985). Начальная цена с НДС 20 % – 47 760,00 руб. Задаток – 4 776,00 руб.

Лот № 5: Авиадвигатель АШ-62ИР К16447192 (инв. № 0000001215, заводской № К16447192, год выпуска 1987). Начальная цена с НДС 20 % – 47 760,00 руб. Задаток – 4 776,00 руб.

Местонахождение Лотов №№ 1–5:
Республика Беларусь, Гродненский р-н, Гродненская обл., Аэропорт
Шаг электронных торгов – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **24.10.2024 в 16.00.**

Организатор электронных торгов:
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52,
torgi@ino.by.
Электронный адрес ЭТП: gostorg.by

УНП 190055182

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор аукциона)
извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества должника

Аукцион состоится **09.10.2024 в 14.00** по адресу:
г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Лот № 1:

Административно-торговое помещение с инв. № 500/D-708167929.

Площадь – 2539,8 кв. м.
Назначение: административно-торговое помещение. Принадлежностью являются дворовые сооружения и газоны.
Адрес: г. Минск, ул. Матусевича, 35-4.

Обременение: 1. В отношении административно-торгового помещения с инв. № 500/D-708167929 имеются действующие договоры аренды. 2. Арест.

Начальная цена продажи – 4 393 440,00 руб.
Задаток – 439 344,00 руб.

Административно-торговое помещение с инв. № 500/D-708167929 находится в капитальном строении с инв. № 500/С-32287, расположенном на земельном участке 500000000006002282 площадью 2,8867 га.

Целевое назначение: для эксплуатации и обслуживания здания многофункционального по ул. Матусевича, 35, зданий неустановленного назначения (здание административно-бытового корпуса, здание производственного корпуса, здание охраны) по ул. Матусевича, 35, корп. 1, 2, 3. Право общего долевого постоянного пользования земельным участком. Доля 3/25.

Шаг аукциона – 5 %.

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 % (далее – Претендент на покупку), – обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня проведения аукциона. Указанный срок перечисления денежных средств Победителем аукциона (Претендентом на покупку) может быть на основании его письменного ходатайства однократно продлен по согласованию с уполномоченным органом, но не более чем на 20 рабочих дней.

2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона.

3. Переход права собственности на приобретённый на аукционе Объект недвижимости осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Регламентом о порядке организации и проведения аукционов РУП «Институт недвижимости и оценки» от 29.07.2024.

Порядок проведения аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7 в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00. Окончание приема заявлений – **07.10.2024 в 11.00.**

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении электронных торгов
по продаже имущества, принадлежащего
ОАО «Премьерлизинг» (Продавец)

Электронные торги состоятся 25.10.2024.

Лот № 1: Торговое помещение (инв. №: 350/D-195209), площадь – 594,3 кв. м.

Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Фадеева, 1-1.

